РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 чэрвеня 1917 г.

28 ЛЮТАГА 2025 г. ПЯТНІЦА № 41 (30429)



# АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ДАЎ ІНТЭРВ'Ю АМЕРЫКАНСКАМУ БЛОГЕРУ

**Новыя рэаліі, новыя фарматы, новыя медыя і нязменная адкрытасць і прамалінейнасць беларускага лідара — усё аб'ядналася ў гэтай размове.**

(Падрабязнасці на стар. 2–3)

ПЯЦІГОДКА ЯКАСЦІ

# BELARUS — ГУЧЫЦЬ ГОДНА

## Як на МТЗ кантралююць якасць

Калі гаварыць аб якасці, праверанай часам, першае, што прыходзіць на думку, напэўна, кожнаму беларусу, — Мінскі трактарны завод. Прадпрыемства з багатай гісторыяй, МТЗ сёння з'яўляецца флагманам айчыннага машынабудавання, адным з лідараў на рынках Беларусі, Расіі і іншых краін СНД па вытворчасці сельскагаспадарчай тэхнікі. Аб аўтарытэце і даверы да прадукцыі прадпрыемства гаворыць мноства ўзнагарод, сярод якіх і Дзяржаўны знак якасці Беларусі. Карэспандэнты «Звязды» наведалі МТЗ, пабывалі ў цэхах завода і пастараліся высветліць, у чым сакрэт вытворчасці трактара BELARUS; даведацца, з чаго пачынаецца якасць.

СТАР. 8













УСЕ ГРОШЫ ЗА... БЯСПЛАТНЫ СЫР

7



ІНСУЛЬТ ЦЯПЕР НЕ ПРЫСУД?

10

Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!

ПРЭМ'ЕРА РУБРЫКІ

# ЦЫТАДЭЛІ МУЖНАСЦІ

Гэты дзень мы набліжалі, як маглі. 9 мая

**Менавіта так вобразна называюць беларускія паселішчы, уганараваныя вымпелам «За стойкасць і мужнасць у гады Вялікай Айчыннай вайны». Іх па краіне 36, сярод іх — і буйныя абласныя гарады, і зусім невялікія пасёлкі. Аб'ядноўвае іх адно — гісторыя супраціўлення фашыстам, якую пісалі самі мясцовыя жыхары. Мужнасцю, нянавісцю да акупантаў, нярэдка ўласным жыццём. Яны разам з Чырвонай Арміяй прыбліжалі Дзень Перамогі. Як маглі — змагаючыся ў партызанскіх атрадах, у падполлі. Поспех аперацыі «Баграціён» па вызваленні Беларусі, якую цяпер прыводзяць у прыклад ва ўсіх падручніках па ваеннай справе, не быў бы такім літаральна ашаламляльным, калі б не барацьба беларусаў у тыле ворага.**

**У праекце «Гэты дзень мы набліжалі, як маглі» «Звязда» раскажа пра асобныя населеныя пункты, узнагароджаныя за стойкасць і мужнасць, з усіх рэгіёнаў Беларусі. Кожная гісторыя — унікальная, кожная гісторыя — гісторыя подзвігу звычайных людзей, нашых з вамі зусім недалёкіх па часе продкаў.**




Адкрывае праект Сураж, што пад Віцебскам. «Балада аб чатырох заложніках» — гэта менавіта там...

СТАР. 9

ISSN 1990 — 763X

# АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ДАЎ ІНТЭРВ'Ю АМЕРЫКАНСКАМУ БЛОГЕРУ, ПРАДСТАЎНІКУ НОВЫХ МЕДЫЯ

## На Захадзе ёсць інтарэс да пазіцыі Беларусі і меркавання яе лідара

Адкрытасць, з якой Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка дае інтэрв'ю, вядома многім. На ўсе пытанні прадстаўнікоў медыясупольнасці кіраўнік дзяржавы заўжды адказвае прама і шчыра, не шкадуючы эксклюзіўных фактаў і красамоўных жыццёвых прыкладаў. Чаго толькі вартая прэс-канферэнцыя Прэзідэнта 26 студзеня, калі ён чатыры гадзіны адказваў на пытанні беларускіх і замежных журналістаў. Адкрыты Аляксандр Лукашэнка і да новых медыя. Прыклад таму — інтэрв'ю беларускага лідара Марыа Наўфалу, аўтару праекта «Круглы стол» на платформе X.



Новыя рэаліі, новыя фарматы, новыя медыя і нязменная адкрытасць і прамалінейнасць беларускага лідара — усё аб'ядналася ў гэтай размове. Марыа Наўфал — адзін з найбуйнейшых блогераў платформы «Спэйсіс» і сацыяльнай сеткі X з двума мільёнамі падпісчыкаў. Найбольш паспяховы праект — «Круглы стол», у рамках якога выходзяць відэаінтэрв'ю з палітычнымі і грамадскімі дзеячамі. У рамках праекта ўжо выйшлі інтэрв'ю з членам правячай сям'і Саудаўскай Аравіі, мільярдэрам Аль-Валід ібн Талал Аль Саудам, былой Прэзідэнтам Венгрыі Каталін Новак, экс-Прэзідэнтам Бразіліі Жаірам Балсанару, былым прэм'ер-міністрам Пакістана Імранам Ханам, амерыканскімі кангрэсменамі. Літаральна на гэтым тыдні выйшла інтэрв'ю з прэм'ер-міністрам Славакіі Робертам Фіца.

За паўтары гадзіны, што працягвалася размова Марыа Наўфала і Аляксандра Лукашэнкі, уздымаліся пытанні нармалізацыі адносін паміж Усходам і Захадам. Адна з самых цікавых тэм — дыялог ЗША і Расіі, перспектывы ўрэгулявання канфлікту ва Украіне і ролі ў гэтым новай адміністрацыі ЗША. Блогер задаваў Прэзідэнту пытанні, звязаныя з геапалітыкай і сучаснай сітуацыяй у міжнародных адносінах. І атрымаў на іх разгорнутыя адказы. Інакш быць не магло. Нездарма ж у прэс-службу беларускага лідара паступае шмат запытаў на інтэрв'ю менавіта ад заходніх медыя. Гэта сведчыць аб тым, што на Захадзе цікавяцца меркаваннем Прэзідэнта Беларусі наконт міжнароднага парадку дня.

### «ПЫТАННІ УКРАІНЫ БЕЗ УКРАІНЫ НІХТО ВЫРАШАЦЬ НЕ БУДЗЕ»

У прыватнасці, Марыа Наўфал спытаў у Аляксандра Лукашэнкі, ці абмяркоўваў ён са сваім расійскім калегам Уладзімірам Пуціным стасункі ЗША і Расіі, тэлефонную размову з Дональдам Трампам і іншыя важныя падзеі. Беларускі лідар расказаў, што пакуль яны з расійскім лідарам разглядалі гэтыя пытанні толькі ў агульных рысах, падрабязна ўсё абмеркаваць яшчэ будзе магчымасць.

**«Праз тыдзень мы з ім сустрэнемся ў Маскве, і мы вельмі падрабязна і дэталёва пагаворым па ўсіх пытаннях. Па тэлефоне мы на гэта і спаслаліся, што сустрэнемся і абмяркуем усе пытанні ў дэталях», — сказаў кіраўнік дзяржавы.**



У той жа час прэзідэнты паспелі абмеркаваць здзелку ЗША і Украіны па рэдказямельных матэрыялах. Аляксандр Лукашэнка расказаў, што сам падняў гэта пытанне ў размове з расійскім калегам:

**«Гавару: дзіўна неяк — амерыканцы патрабуюць ад Украіны аддаць ім найважнейшае тое, што ў іх ёсць. Размова ж не толькі аб рэдказямельных матэрыялах ідзе ў ЗША. Ідзе ж гаворка аб прыродным газе, аб нафце, аб лагістыцы (аб партах) і гэтак далей. Тут жа шырэйшае пытанне.**

І я Пуціну выклаў сваю пазіцыю вось у такім ключы. На што ён сказаў, што «амерыканцы б'юцца ў адчыненыя дзверы, гэта ёсць усё ў Расіі, мы можам з імі дамовіцца і працаваць». А потым публічна гэта агучыў», — расказаў беларускі лідар. Што тычыцца дамоўленасцяў па Украіне, то Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў: пазіцыя Расіі не змянілася. «Ён (Уладзімір Пуцін. — **«Зв.»**) яшчэ раз пацвердзіў, што «мы за, мы гатовы сесці за стол перагавораў, гатовы весці перагаворы па Украіне. Калі гэта датычыцца Украіны — з украінцамі. Потым ён працягнуў, кажа, што ўкраінцы і Зяленскі крыўдзяцца, што іх не паклікалі ў Саудаўскую Аравію. Кажа, а навошта іх клікаць, калі там пытанні былі Расіі і ЗША, там толькі мімаходзь закранулі пытанні Украіны. Таму навошта было клікаць Украіну? Ну, аб гэтым ужо і Трамп сказаў у гэтым ключы. Калі будуць вырашацца пытанні Украіны, я думаю, без Украіны, гэтыя пытанні ніхто вырашаць не будзе», — сказаў Прэзідэнт.

Па меркаванні беларускага лідара, пагадненне паміж ЗША і Украінай па рэдказямельных металах можа насцярожваць Расію і, хутчэй за ўсё, насцярожвае. «Я так думаю. Я не абмяркоўваў з Расіяй і з Пуціным гэтыя пытанні. Мы абмяркуем гэтае пытанне. Але, хутчэй за ўсё, гэта можа насцярожваць, калі Расія адчуе, што гэтыя дамоўленасці будуць выходзіць за рамкі эканамічных адносін. Калі гэта будзе чыстая эканоміка, не звязаная з ваенна-прамысловым комплексам, зброяй, узброенымі сіламі, чаму б і не? — удакладніў ён. — Так, непрыемна, што магутная дзяржава ў выглядзе Злучаных Штатаў Амерыкі ў цябе пад плотам, за акном будзе распрацоўваць карысныя выкапні, ствараць свае прадпрыемствы і гэтак далей. Напэўна, не вельмі прыемна. Гэта мог бы рабіць ты, але робяць іншыя. Але гэта Расія перажыве. Расія вялізная, і ў яе гэтага дабра хапае».

Марыа Наўфал пацікавіўся, як расійскі бок рэагуе на прапановы накіраваць на Украіну міратворчыя сілы з еўрапейскіх краін.

**«Расія ніколі з гэтым не пагодзіцца. Прынамсі, такая пазіцыя Расіі на сёння. Тым больш што кіраўніцтва Еўрапейскага саюза, перш за ўсё ў асобе Германіі і Францыі, займае вельмі агрэсіўную пазіцыю на гэты момант, — адказаў кіраўнік дзяржавы. — Расія катэгарычна супраць усялякіх міратворчых сіл з боку еўрапейскіх дзяржаў».**

**Валерыя СЦЯЦКО.**
**Фота БелТА.**

## У тэму

**Марыя НАЎФАЛ:**

### Заявы аб міры — не проста словы. Прэзідэнт Лукашэнка сапраўды гэтага хоча

Марыя Наўфал як блогер лічыць сябе максімальна аб'ектыўным чалавекам. Сваёй місіяй ён называе выбудоўванне мастоў паміж Захадам і Усходам з дапамогай новых медыя. Пры гэтым ён выступае за тое, каб ЗША і Расія сталі сапраўднымі саюзнікамі.

Размову з Прэзідэнтам Беларусі Марыя Наўфал назваў неверагодна цікавай. «Даволі шмат журналістаў задавалі Аляксандру Лукашэнку розныя пытанні. І часта гэтыя пытанні былі з падвохам, ім трэба было злавіць чалавека на слове, па-за кантэкстам даць нейкую фразу, каб гэта спадабалася босам гэтых журналістаў», — звярнуў увагу блогер, падкрэсліўшы, што яго місія і задача — напрамую данесці заходняй аўдыторыі пазіцыю Беларусі, агучаную яе лідарам. Па яго словах, гэта рабілася для таго, каб максімальна пашырыць разрыў паміж Усходам і Захадам, Беларуссю і Еўропай. «Я думаю, ёсць нешта, што Еўропе не падабаецца ў Беларусі, і ёсць нешта, за што ў Беларусі не любяць еўрапейцаў. Але ж вы, беларусы, жывяце з еўрапейцамі на адным кантыненце, і, нягледзячы ні на што, захоўваюцца сувязі, ёсць адносіны паміж людзьмі.

> **Я перакананы, што нам трэба размаўляць. Магчыма, калі б было больш такіх размоў, як сёння, мы не апынуліся б у сітуацыі канфлікту, які сёння назіраем», — заўважыў Марыя Наўфал.**



> **Самым важным паведамленнем, пачутым ад беларускага лідара, блогер назваў імкненне і шчырае жаданне міру. «Ён згадаў, што вельмі па-добраму, па-сяброўску ставіўся да Зяленскага. І я зразумеў, што для яго гэтыя заявы аб міры — не проста словы, ён сапраўды гэтага хоча», — адзначыў Марыя Наўфал.**

Блогер заўважыў, што сёння ні ў чым нельга быць упэўненым на ўсе 100 працэнтаў, тым больш у палітыцы. Асабліва калі размова ідзе пра амерыканскую палітыку, дзе кожныя чатыры гады мяняецца ўлада і, адпаведна, палітычны курс краіны. «Што я магу сказаць дакладна — гэта тое, што сёння Трамп дзейнічае з такой хуткасцю, што, магчыма, калі будзе дасягнута нармалізацыя адносін з Расіяй, то павярнуць назад гэтыя вынікі будзе амаль немагчыма. І яшчэ адзін момант — людзі пачынаюць прачынацца, яны пачынаюць разумець, што ў кожнай гісторыі ёсць два бакі і не ўсё чорна-белае», — адзначыў блогер.

МІЖНАРОДНЫ ВЕКТАР

# «НАШЫ МЭТЫ ІДЭНТЫЧНЫЯ — ДАБРАБЫТ І ЖЫЦЦЁ ГРАМАДЗЯН»

## Акцэнты сустрэчы Наталлі КАЧАНАВАЙ з паслом Казахстана

**Старшыня Савета Рэспублікі павіншавала Цімура Жаксылыкава з прызначэннем на высокую дыпламатычную пасаду і пажадала поспехаў у рабоце на карысць дзвюх краін і народаў. Па яе словах, ад работы пасла многае залежыць у выбудоўванні добрых адносін, якія гістарычна склаліся паміж краінамі.**

### «МІР І ЗГОДА ВЫХОДЗЯЦЬ НА ПЕРШЫ ПЛАН»

«Беларусь і Казахстан звязваюць гістарычныя карані, — падкрэсліла спікер. — Узровень узаемадзеяння паміж нашымі краінамі сёння можна назваць стратэгічным. Гэта, вядома, склалася ў многім дзякуючы нашым прэзідэнтам, якія вельмі шчыльна ўзаемадзейнічаюць. Мы павінны зрабіць усё для таго, каб рэалізаваць тыя дамоўленасці, якія былі дасягнуты».

Наталля Качанава звярнула ўвагу на тое, што ўзаемадзеянне Беларусі і Казахстана наладжана па ўсіх кірунках. «Гэта і гандлёва-эканамічнае супрацоўніцтва: Казахстан уваходзіць у дзясятку краін, з якімі ў нас склаліся добрыя вынікі, — канкрэтызавала яна. — Гэта і гуманітарнае супрацоўніцтва, супрацоўніцтва міжпарламенцкае, што для нас вельмі важна».

Беларусь і Казахстан актыўна ўзаемадзейнічаюць на міжнародных пляцоўках. «Склаліся добрыя адносіны ў рамках Міжпарламенцкай Асамблеі краін СНД, Асамблеі АДКБ, мы сталі паўнапраўнымі членамі Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва — сімвалічна, што гэта адбылося ў Казахстане, — канкрэтызавала спікер. — Мы ўдзячны вам за падтрымку. Вельмі важна ўзаемадзейнічаць у гэтых арганізацыях».

Старшыня Савета Рэспублікі праінфармавала, што Беларусь стала краінай-назіральніцай у Азіяцкай парламенцкай асамблеі. «У чарговы раз пераканалася ў тым, што мір і згода ў кожнай краіне, узаемадзеянне сёння выходзяць на першы план, — адзначыла Наталля Качанава. — Нам трэба супрацоўнічаць, узаемадзейнічаць, асабліва ў міжнародных арганізацыях падтрымліваць адзін аднаго, бо нашы мэты абсалютна ідэнтычныя — дабрабыт і жыццё грамадзян у нашых краінах. А калі казаць аб знешнім контуры, то гэта мір, суверэнітэт, незалежнасць, неўмяшанне ва ўнутраныя справы краін».

### «БОЛЬШ ХУТКІ ШЛЯХ ДА СУПРАЦОЎНІЦТВА»

Кажучы аб міжпарламенцкім узаемадзеянні з Казахстанам, спікер заявіла аб інтэнсіфікацыі супрацоўніцтва. Пацвярджэннем гэтага стануць узаемныя візіты міжпарламенцкіх дэлегацый, запланаваныя на бягучы год.

Што датычыцца гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва, паміж краінамі створана добрая дагаворна-прававая база, дзейнічае каля 80 міжурадавых пагадненняў. «Самі лічбы ўжо на працягу некалькі гадоў — больш як мільярд тавараабароту — гэта добры паказчык, — канстатавала Наталля Качанава. — У нас з казахстанскім капіталам працуе звыш 50 прадпрыемстваў, больш тысячы беларускіх арганізацый працуюць у Казахстане. Разам з тым мы разумеем, што перспектывы ёсць, аб гэтым заўсёды гаворыць Прэзідэнт нашай краіны. Мы гатовы да далейшага супрацоўніцтва, пастаўляць тыя тавары і прадукцыю, якія неабходныя сёння Казахстану».

Старшыня Савета Рэспублікі лічыць неабходным актывізаваць міжрэгіянальнае супрацоўніцтва. «Падпісана каля 30 пагадненняў паміж гарадамі, рэгіёнамі, гэту работу трэба працягваць, — перакананa спікер. — Гэта больш хуткі шлях да супрацоўніцтва. У нас ёсць дарожная карта супрацоўніцтва, рэалізацыю якой адсочваюць нашы ўрады. Мы гаварылі з Маўленам Сагатханулы (старшыня Сената Парламента Рэспублікі Казахстан. — **«Зв.»**) аб тым, што гатовы падключыцца да кантролю за выкананнем гэтых пагадненняў, якія дасягнуты на вышэйшым узроўні, і мы гэта будзем рабіць. У рэгіянальным супрацоўніцтве мы павінны вельмі шчыльна папрацаваць. Гэта дае свой вынік: гэта і імпартазамяшчэнне, і стварэнне сумесных вытворчасцяў, гэта і гуманітарнае супрацоўніцтва, і маладзёжная палітыка, і грамадскія арганізацыі».

Рэзюмуючы, Наталля Качанава падкрэсліла, што Беларусь гатова да супрацоўніцтва абсалютна па ўсіх кірунках.



Фота БелТА.

> **«Мы будзем працягваць палітыку, якую праводзяць нашы кіраўнікі дзяржаў, — падкрэсліла яна. — Для нас гэта вельмі важна. Асабліва ў сучасных рэаліях, калі краіны павінны аб'ядноўвацца для таго, каб жыць у міры і спакоі. І самае галоўнае, каб народы нашых краін не адчувалі ніякага дыскамфорту ад таго, што адбываецца ў некаторых краінах».**

### «ТРЭБА МАБІЛІЗАВАЦЦА І ЗРАБІЦЬ ДАЛЕЙШЫ РЫВОК»

У сваю чаргу, **Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Казахстан у Рэспубліцы Беларусь Цімур ЖАКСЫЛЫКАЎ** падкрэсліў, што Казахстан і Беларусь — стратэгічныя саюзнікі і партнёры. «Сітуацыя геапалітычная ў свеце вельмі турбулентная, складаная эканамічная сітуацыя, але, нягледзячы на гэта, Казахстан і Беларусь паспяхова развіваюцца самі і развіваюць двухбаковыя адносіны па ўсім спектры ўзаемадзеяння, — канстатаваў пасол. — А яно ў нас вельмі шырокае. Фактычна няма такіх сфер супрацоўніцтва, па якіх у нас не былі б шчыльныя сувязі».

Па словах пасла, высокі ўзровень супрацоўніцтва, дасягнуты ў апошнія гады, з'яўляецца вынікам палітычнай волі і паслядоўнага курсу, які рэалізуюць лідары дзвюх краін. «У гэтай сувязі Казахстан з вялікім задавальненнем успрыняў вынікі выбараў, якія адбыліся 26 студзеня, што нам дазваляе з упэўненасцю разлічваць на далейшае развіццё нашага стратэгічнага супрацоўніцтва і партнёрства», — звярнуў увагу дыпламат.

Кажучы аб гандлёва-эканамічным супрацоўніцтве, Цімур Жаксылыкаў пагаджаецца са спікерам, што варта рухацца далей. «Мы, праўда, затармазіліся вакол гэтай лічбы — 1 мільярд долараў тавараабароту, — заўважыў ён. — Трэба мабілізавацца і зрабіць далейшы рывок. Эканоміка Беларусі вельмі ўпэўнена глядзіць у будучыню, упэўнена развіваецца. Але нельга спыняцца на дасягнутым. У нас вялікі патэнцыял развіцця».

**Вераніка КАНЮТА.**

МЕДЫЯСФЕРА

# У ПАШАНЕ — АБ'ЕКТЫЎНАЯ ПРАВЕРАНАЯ ІНФАРМАЦЫЯ

## Узровень даверу да дзяржаўных СМІ расце



Аб тым, наколькі важна сёння даваць чытачу і гледачу правераную праўдзівую інфармацыю, аб тым, што менавіта яна — галоўная зброя ў інфармацыйным супрацьстаянні, ішла размова на выніковай калегіі Міністэрства інфармацыі.

### РУХАЕМСЯ Ў ПРАВІЛЬНЫМ КІРУНКУ

**Міністр інфармацыі Марат МАРКАЎ** адзначыў: «Калі гаворым пра вынікі, мы гаворым у першую чаргу пра ўзровень даверу да дзяржаўных сродкаў масавай інфармацыі. Лічбу можна агучыць. Паводле сацдаследавання, якое заказваў Мінінфарм, па выніках 2024 года 59,9 % — гэта значыць, практычна 60 % насельніцтва давярае дзяржаўным сродкам масавай інфармацыі. З 2021 года гэтая лічба вырасла больш чым на 21 %. Вы працуеце добра — не толькі Міністэрства інфармацыі, хоць мы, вядома, гэтаму працэсу спрыяем, у тым ліку і праз Указ № 131 — фактычна праз грантавую сістэму, якая дзякуючы Прэзідэнту з'явілася ў краіне. За кошт гэтага павялічваецца аб'ём нацыянальнага кантэнту».

Марат Маркаў агучыў лічбы: на 1 студзеня 2025 года ў краіне налічваецца 1139 сродкаў масавай інфармацыі, з іх 71 — сеткавы. Больш за дзве тысячы замежных СМІ распаўсюджваюцца ў Беларусі. Нацыянальны кантэнт у сукупнасці складае больш за 70 % — і гэта выдатны паказчык, падкрэсліў міністр інфармацыі. Ён таксама адзначыў рост колькасці карыстальнікаў у інтэрнэт-асяроддзі: толькі ў рэспубліканскіх СМІ на YouTube налічваецца да 7,5 млн карыстальнікаў, што склала прырост на 44 % карыстальнікаў за год — каласальная лічба.

У рэгіянальных СМІ, са слоў Марата Маркава, яна яшчэ вышэйшая — 53 %. Сукупная аўдыторыя — 5,8 млн карыстальнікаў. «Калі мы такімі тэмпамі будзем прырастаць, значыць, будзем гаварыць пра тое, што выконваем сваю задачу па прыцягненні ў першую чаргу моладзі да нашай інфармацыі, да дзяржаўных СМІ. Міністэрства інфармацыі за мінулы год заблакіравала доступ да больш чым 3150 інтэрнэт-рэсурсаў дэструктыўнай накіраванасці. Гэта сур'ёзныя лічбы, якія паказваюць, што ўвага да нас з боку нашых апанентаў не змяніцца», — адзначыў міністр інфармацыі. Аднак тое, што мы эфектыўна з гэтым працуем, сведчыць, што рухаемся ў правільным кірунку, падкрэсліў Марат Маркаў.

Таксама міністр інфармацыі расказаў, што ў краіне выкарыстоўваецца грантавы прынцып, дзякуючы якому на рэгіянальным і рэспубліканскім узроўнях ствараюцца новыя адукайныя праекты. «Яны ёсць практычна ў кожнай вобласці. У іх вядзецца контрпрапаганда, прадстаўлена добрая аналітыка, развенчваюцца фэйкі. Мы ў абавязковым парадку будзем стымуляваць падобнага роду праекты. Аднак гэта не адмяняе агульнага падыходу па садзейнічанні павелічэнню прафесійнай адукаванасці журналістаў і аб'ёму нацыянальнага кантэнту».

Міністр інфармацыі таксама расказаў, як прасоўваецца стварэнне медыяхолдынга Саюзнай дзяржавы. Паводле яго слоў, пасля вялікай падрыхтоўчай работы і канкрэтных юрыдычных крокаў мае адбыцца фарміраванне стратэгіі развіцця прадпрыемства, стратэгіі развіцця інфармацыйнай прасторы і стварэнне міждзяржаўнага дагавора, які будзе вызначаць правілы работы, у тым ліку прадстаўніцтва на тэрыторыі Беларусі.

### БЛОГАСФЕРА БУДЗЕ РАЗВІВАЦЦА

Міністэрства інфармацыі будзе стымуляваць развіццё блогасферы ў краіне, паведаміў Марат Маркаў.

«Давайце прама скажам: у нас некаторы час таму з'явілася так званая аўтарская журналістыка. Мы вельмі шмат увагі гэтаму аддавалі і стымулявалі яе развіццё. Мінулы год стаў дастаткова добрым, на мой погляд, стартам, калі дзяржава ўпершыню практычна звярнула ўвагу на блогасферу», — сказаў міністр інфармацыі, адказваючы на пытанне пра тэндэнцыі ў сучаснай беларускай журналістыцы.

У сувязі з гэтым міністр нагадаў, што ў верасні 2024 года прайшоў першы форум блогераў, сукупная аўдыторыя яго ўдзельнікаў — 27 млн карыстальнікаў. «Для першага форуму, я лічу, выдатны вынік, а самае галоўнае — гэта выклікала вялікую і непадробную цікавасць. Потым гэтыя ж дзяўчаты і хлопцы ўдзельнічалі ў тым ліку і ў «Марафоне адзінства», паказвалі прыгажосць нашай зямлі, нашых прадпрыемстваў», — дадаў ён.

Гэты кірунак, са слоў міністра інфармацыі, падхапіла Магілёўская вобласць, якасна праявіўшы адзін з тэлепраектаў. Міністэрства інфармацыі будзе звяртаць асаблівую ўвагу на гэты кірунак.

«Як бы там ні было, гэта адзін з новых інструментаў, які раней быў крыху для нас, для дзяржавы, па рэштковым прынцыпе. А цяпер, я лічу, ён павінен стаць адным з дзейсных інструментаў для таго, каб уплываць, у тым ліку на маладзёжнае асяроддзе», — сказаў напрыканцы Марат Маркаў.

**Яна ВАЛАСАЧ.**
**Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.**

### Даслоўна

#### «Мы кантралюем наша інфармацыйнае поле»

**Намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Уладзімір ПЯРЦОЎ** у гутарцы з журналістамі адзначыў, што такія паняцці, як фэйкі, інфармацыйныя войны, гібрыдныя войны, супрацьстаянне ў некаторай ступені ўжо становяцца збітымі. «Мы менш звяртаем увагі, дзесьці супакоіліся поспехамі, якіх мы ў пэўнай ступені дасягнулі», — заўважыў ён.

Не толькі СМІ годна супрацьстаяць укідам і фэйкам, але і насельніцтва, паводле слоў Уладзіміра Пярцова, навучылася вызначаць адкрыта хлуслівую інфармацыю.

«Мінулая выбарчая кампанія — шмат у чым доказ таго, што мы кантралюем наша інфармацыйнае поле. Мы годна супрацьстаім укідам, фэйкам. Ды і людзі сталі мудрэйшымі, навучыліся сартаваць, аддзяляць адкрыта хлусліваю інфармацыю, інфармацыю, накіраваную на стварэнне негатыўнага фону, негатыўных эмоцый, ад праўды, ад інфармацыі, якая вартая ўвагі», — сказаў ён.

Намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта таксама падкрэсліў, што прадстаўнікам СМІ не трэба цешыць сябе, спачываць на лаўрах, паколькі тыя, хто па-ранейшаму супрацьстаіць нам па той бок барыкад, — гэта людзі тэхналагічныя.

«Няхай яны на некаторы час абмежаваны ў вялікіх, шматмільённых рэсурсах, але ўсё ж такі гэтыя рэсурсы ў іх з'явяцца і, напэўна, супрацьстаянне працягнецца», — сказаў Уладзімір Пярцоў, дадаўшы, што ў першую чаргу гэта будзе барацьба за розумы тых, хто маладзейшы, тых, хто павінен прыйсці на выбарчыя ўчасткі ў 2030 годзе.

Спікер адзначыў, што Міністэрства інфармацыі павінна стаць органам-рэгулятарам для ўсіх пастаўшчыкоў кантэнту — не толькі традыцыйных СМІ.

«Міністэрства інфармацыі павінна стаць органам-рэгулятарам, родным домам не толькі для так званых традыцыйных СМІ, але і для тых, хто ў цэлым фарміруе медыяландшафт нашай краіны. Гэта і сеткавыя выданні, інтэрнэт-рэсурсы, папулярныя блогеры, ананімныя тэлеграм-каналы — увогуле ўсе, хто стварае кантэнт. Усе тыя, хто фарміруе светапогляд людзей. Усе тыя, хто фарміруе парадак дня», — сказаў Уладзімір Пярцоў.



### Кампетэнтна

#### ДзяржСМІ важна не аслабляць напор, захоўваць і ўзмацняць свае пазіцыі

Пра гэта заявіў **намеснік прэм'ер-міністра Ігар ПЕТРЫШЭНКА,** выступаючы на пасяджэнні калегіі.

— У цэлым міністэрства з пастаўленымі задачамі справілася, — даў ацэнку вынікам дзейнасці профільнага міністэрства ў 2024 годзе Ігар Петрышэнка. — Выбудавана сістэмная работа ў медыясферы, наладжана дзейснае ўзаемадзеянне са СМІ ўсіх узроўняў. У сваю чаргу СМІ дэманстравалі ўменне хутка перабудоўвацца, працаваць актыўна і ярка.

Асобна ён адзначыў паспяховую інфармацыйную работу Міністэрства па падрыхтоўцы і правядзенні электаральнай кампаніі:

— Важна не аслабляць напор, захоўваць і ўзмацняць гэтыя пазіцыі.

Профільны віцэ-прэм'ер падкрэсліў: сёння пры разнастайнасці крыніц інфармацыі важна не толькі ствараць якасны і прафесійны медыяпрадукт, але і забяспечваць аб'ектыўнае адлюстраванне ў СМІ і на інтэрнэт-рэсурсах грамадска значнай інфармацыі і мер, якія прымаюцца па вырашэнні вострых сацыяльна-эканамічных і грамадска-палітычных праблем.

— Акрамя таго, ва ўмовах беспрэцэдэнтнага знешняга ціску СМІ павінны максімальна аператыўна рэагаваць на недакладную, дэструктыўную інфармацыю, — падкрэсліў Ігар Петрышэнка.

Ён нагадаў, што менавіта гэтым мэтам служыць Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Аб рэагаванні на грамадска значную інфармацыю»:

— Указам устаноўлены абавязкі дзяржаўных органаў і арганізацый, сродкаў масавай інфармацыі па размяшчэнні на дзяржаўных інтэрнэт-рэсурсах, афіцыйных сайтах інфармацыі па вострых сацыяльна-эканамічных і грамадска-палітычных праблемах. Такім чынам, неабходная для работы нарматыўная база створана.

Што тычыцца дзейнасці ведамасных выданняў, ён нацэліў:

— Задача — арганізаваць на належным узроўні работу з электроннымі рэсурсамі. Далёка не ўсе ведамасныя выданні маюць свае асобныя сайты, імкнучыся выкарыстоўваць інтэрнэт-рэсурс міністэрства або ведамства.

Гаворачы аб дзейнасці тэлеканалаў, Ігар Петрышэнка канстатаваў: яны доказалі, што ўмеюць працаваць ярка, смела і напорыста:

— Лічу, што тэлебачанне павінна быць менавіта такім — актыўна трансліраваць гледачу выразную, прадзяржаўную, патрыятычную пазіцыю сучаснымі інструментамі журналістыкі.

Звяртаючыся да кіраўнікоў тэлеканалаў, Ігар Петрышэнка акцэнтаваў увагу на неабходнасці падтрымкі трэнду на развіццё турызму:

— Нам патрэбныя свежыя ідэі, новыя праграмы, асабліва арыентаваныя на моладзь, якія будуць папулярызаваць нашу краіну і адпачынак у Беларусі. Наведванне гістарычных месцаў, прамысловы турызм, экалагічны турызм — усё гэта можна і трэба паказваць на тэлебачанні, сеткавых рэсурсах.

САЦЫЯЛЬНЫ ВЕКТАР

# НОВАЕ Ў ЗАКАНАДАЎСТВЕ І ЭЛЕКТРОННЫЯ БАЛЬНІЧНЫЯ, ПЛАНЫ ПА ПАВЕЛІЧЭННІ ПЕНСІЙ

## Мінпрацы падзялілася мэтамі на найбліжэйшую перспектыву

Рост даходаў і пакупніцкай здольнасці зарплат і пенсій, шэраг важных сацыяльных навацый, замацаваных заканадаўча, падаўжэнне праграмы «Сямейны капітал», новаўвядзенні па бальнічных, з-за чаго ў пераважнай большасці тых, хто хварэў, выраслі выплаты — вось асноўныя вынікі мінулага года ў сацыяльнай сферы.

### ПРАЦОЎНЫ КОДЭКС ЧАКАЮЦЬ ЗМЯНЕННІ



**Міністр працы і сацыяльнай абароны Наталля ПАЎЛЮЧЭНКА** расказала пра кірункі, па якіх будзе працаваць ведамства ў бягучым годзе. Што датычыцца працоўнай сферы, то тут ёсць запыт на развіццё працоўных адносін, а менавіта на развіццё новых форм дыстанцыйнай занятасці, удасканаленне кантрактнай формы найму, дакладнае размежаванне паміж працоўнымі і грамадзянска-прававымі адносінамі.

— Таму, нягледзячы на тое што з пачатку 2024 года ўступіў у сілу Працоўны кодэкс з яго навацыямі, у нас на парадку дня ў плане падрыхтоўкі законапраектаў на 2025 год — зноў змяненні ў Працоўны кодэкс. У лістападзе бягучага года ўнясём іх ва ўрад. Ужо створана рабочая група, якая непасрэдна выпрацоўвае новыя падыходы, — паведаміла Наталля Паўлючэнка.

### КАЛІ З'ЯВЯЦЦА ЭЛЕКТРОННЫЯ БАЛЬНІЧНЫЯ?

Фонд сацыяльнай абароны насельніцтва летась працаваў збалансавана — прафіцыт бюджэту склаў 2,4 мільярда рублёў, тэмп росту даходнай часткі — 20 %. Рэалізаваны першы этап новага механізма выплаты бальнічных. Цяпер для грамадзян са стажам работы з выплатай узносаў у бюджэт ФСАН дзесяць гадоў і больш бальнічны з першага дня хваробы аплачваецца ў памеры 100 % сярэднядзённага заробку. Наталля Паўлючэнка адзначыла, што вынік другога паўгоддзя, калі рэалізоўваўся новы механізм выплаты бальнічных, вельмі добры і не можа не радаваць. У 67 % тых, хто атрымаў бальнічны, заробак захаваўся ў стапрацэнтным памеры, а сам сярэднядзённы заробак вырас больш як на 27 %.

Цяпер у міністэрстве прыступілі да другога этапу рэалізацыі новага механізма — інтэгрыравацца на электроннай пляцоўцы Міністэрства аховы здароўя і запусціць электронны бальнічны.

### КЛЮЧАВАЯ ЗАДАЧА — ЗАХАВАЦЬ РОСТ ПЕНСІЙ

Як падкрэсліла Наталля Паўлючэнка, ключавая задача — захаваць рэальны рост пенсій, які адпавядаў бы росту заработнай платы. Яшчэ адна навацыя, што плануецца рэалізаваць у 2025 годзе, — пра актыўнае прызначэнне пенсій па інваліднасці. Напрыклад, калі дзіцяці ўстаноўлена інваліднасць, інфармацыя аб гэтым у электронным выглядзе паступае ў пенсіённы орган з МРЭК. Аператыўна, практычна анлайн, па наяўных даных у інфармацыйных рэсурсах, прызначаецца сацыяльная пенсія. Гэта значыць, асабісты зварот у пенсіённыя органы не патрабуецца. Адпаведная работа завяршаецца.

Працягне развівацца сістэма добраахвотнага страхавання «3+3». На сёння заключана больш за 46 тысяч дагавораў.

Адметна, што ўжо ў другім паўгоддзі 2025-га 47 чалавек пачнуць атрымліваць дадатковую пенсію.

— Таму на канкрэтных прыкладах, на канкрэтных людзях, на жывых гісторыях мы пакажам, як гэта сістэма працуе і як яна будзе развівацца, — сказала Наталля Паўлючэнка.

### ПАДТРЫМКА ІНВАЛІДАЎ І МАЛАДЫХ СЕМ'ЯЎ

Амаль усе дзеці да трох гадоў ахоплены дапамогамі. У краіне каля 330 тысяч іх атрымальнікаў. Пры гэтым, як адзначыла міністр, кожны рубель, які выплачваецца з бюджэту дзецям, павінен да іх дайсці.

— Вядома, ключавая задача Камітэтам па працы занятасці і сацыяльнай абароне аблвыканкамаў, Мінскага гарвыканкама — гэта кантроль за мэтавымі выплатамі дапамог. Кожны рубель, які выплачваецца з бюджэту дзеткам, павінен да іх дайсці, — падкрэсліла міністр.

Для гэтага прыняты шэраг мер нарматыўнага, міжведамаснага характару. Для сем'яў, што знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы, выпрацаваны дадатковыя крытэрыі з улікам таго, што такі кантроль павінен ажыццяўляцца на вельмі высокім узроўні.

Што датычыцца дэмаграфічных тэндэнцый, то сёння назіраецца больш высокі ўзрост уступлення ў шлюб, пазнейшае рашэнне аб нараджэнні ў сям'і дзіцяці.

— Мы прыступілі да выпрацоўкі дадатковых мер падтрымкі маладых сем'яў, студэнцкіх сем'яў, у першую чаргу тых, якія плануюць уступіць у шлюб і нарадзіць дзяцей. Безумоўна, гэтыя меры павінны суправаджацца ўсвядомленым разуменнем таго, што сям'я — гэта выдатна, класна, і дзеці, безумоўна, — вялікае шчасце для абаіх, — падзялілася Наталля Паўлючэнка.

Міністр адзначыла адкрыццё на базе сацыяльных устаноў аддзяленняў сацыяльнай рэабілітацыі. Гэта новы кірунак. У мінулым годзе каля 800 чалавек прайшлі ў іх сацыяльную рэабілітацыю. Гэта дадатковая магчымасць для людзей з інваліднасцю для аднаўлення сваіх функцыянальных магчымасцяў.

**Алена КРАВЕЦ.**

## Даслоўна

### Адзначаецца станоўчая дынаміка павышэння ўзроўню жыцця насельніцтва

Пра гэта заявіў **намеснік прэм'ер-міністра Ігар ПЕТРЫШЭНКА** па выніках калегіі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны.

Так, забяспечаны рост рэальных грашовых даходаў. Вырасла пакупніцкая здольнасць заработнай платы, пенсій, дапамог. Па выніках 2024 года рост рэальных грашовых даходаў склаў 109,7 %. Рэальная зарплата па краіне вырасла на 13 %, у бюджэтнай сферы — на 11 %.

Павялічылася таксама памеры працоўных пенсій. Профільны віцэ-прэм'ер нагадаў, што на працягу года было праведзена два пераразлікі, па выніках года рэальны рост працоўных пенсій адзначаны на ўзроўні 110 % да 2023 года. Ігар Петрышэнка нагадаў, што з 1 студзеня бягучага года для працуючых пенсіянераў знята абмежаванне па памеры пенсій.

— Сваё развіццё атрымала праграма «сямейнага капіталу». Яна падоўжаная на наступны пяцігадовы тэрмін — да 2029 года. Пры гэтым пашыраны магчымасці датэрміновага выкарыстання сродкаў па дзейных кірунках, замацаваны маёмасныя правы дзяцей на жылыя памяшканні, набытыя з выкарыстаннем сямейнага капіталу, — акцэнтаваў увагу Ігар Петрышэнка.

Важны момант — сацыялізацыя ў звычайным жыцці тых, хто мае пэўныя праблемы са здароўем. Было адзначана, што ў 2024 годзе працаўладкавана 70,5 тысячы інвалідаў (больш за 60 % ад агульнай колькасці інвалідаў, якія маюць прафесійныя і працоўныя рэкамендацыі).

Ён звярнуў увагу на адну навацыю — доўгачасовы дагляд — як альтэрнатыву стацыянарнай форме сацыяльнага абслугоўвання. Так, на сёння ўжо каля 100 чалавек з хатніх умовах атрымліваюць адначасова медыцынскую дапамогу і сацыяльныя паслугі.

Закрануў Ігар Петрышэнка і тэмы ліцэнзавання прыватных дамоў-інтэрнатаў для пажылых:

— З увядзеннем у 2024 годзе ліцэнзавання дзейнасці прыватных суб'ектаў гаспадарання, якія аказваюць сацыяльныя паслугі ў стацыянарнай форме, разлічваем, што яны таксама стануць несці больш важкую сацыяльную нагрузку і адказнасць, прыўнясуць больш шырокія магчымасці для атрымання якаснай сацыяльнай дапамогі грамадзянам, якія маюць у ёй патрэбу.

Намеснік прэм'ер-міністра таксама падкрэсліў, што ў асаблівай зоне ўвагі дзяржавы — ветэраны Вялікай Айчыннай вайны і асобы, якія пацярпелі ад яе наступстваў. Ён нагадаў, што для павышэння сацыяльнай абароненасці гэтых катэгорый грамадзян у 2024 годзе прыняты Закон «Аб змяненні законаў па пытаннях ветэранаў», які ўступіць у сілу з 1 мая бягучага года.

— Безумоўна, на самым высокім узроўні будуць арганізаваны і праведзены мерапрыемствы ў рамках святкавання 80-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Наш святы абавязак паклапаціцца пра тых, дзякуючы каму была здабыта перамога, — адзначыў Ігар Петрышэнка.

У завяршэнне ён нагадаў, што ў краіне працягваецца рэалізацыя Нацыянальнай стратэгіі «Актыўнае даўгалецце — 2030». У адпаведнасці з ёй у цяперашні час працягваюць працоўную дзейнасць звыш 460 тысяч пенсіянераў, што на 5,7 % больш, чым у 2023 годзе.

СПАЖЫВЕЦ

# ШЫРОКІ АСАРТЫМЕНТ, АЎТАМАТЫЗАЦЫЯ І СТАЎКА НА АЙЧЫННЫЯ ТАВАРЫ

## Як захаваць баланс інтарэсаў вытворцаў і спажыўцоў?



Адной з ключавых задач з'яўляецца развіццё справядлівай канкурэнцыі з улікам захавання ў роўнай ступені інтарэсаў нашых грамадзян, вытворцаў і гандлю. Аб гэтым заявіў міністр антыманапольнага рэгулявання і гандлю Артур КАРПОВІЧ падчас пасяджэння калегіі ведамства, паведаміла БелТА.

Таксама сярод прыярытэтаў — прыняцце дзейсных ахоўных мер па недапушчэнні рэалізацыі ў Беларусі няякаснай, фальсіфікаванай прадукцыі, а таксама тавараў, атрыманых па «шэрых» схемах, у тым ліку праз інтэрнэт-прастору. Як падкрэсліў Артур Карповіч, вельмі важна падтрымліваць дакладныя ўмовы працы ў сферах дзяржзакупак, абароны правоў спажыўцоў, рэкламы, гандлю, грамадскага харчавання, бытавога абслугоўвання насельніцтва, антыманапольнага рэгулявання.

З улікам істотнай інфарматызацыі і аўтаматызацыі ў сферах гандлю і паслуг міністр лічыць неабходным удзяліць асаблівую ўвагу развіццю магазінаў без прадаўцоў і касіраў, з мінімальнай колькасцю персаналу. «Магчыма, такім аб'ектам будуць давацца льготы і прэферэнцыі. Аўтаматызацыя — гэта адзін з кірункаў развіцця гандлю і бытавога абслугоўвання», — адзначыў міністр.

Яшчэ адна задача — якаснае забеспячэнне спажыўцоў краіны шырокім асартыментам тавараў па даступных цэнах, у тым ліку прадукцыяй беларускіх вытворцаў. Гэта датычыцца і сельскіх населеных пунктаў.

МАРГ рыхтуе праграму дзеянняў для павелічэння долі айчынных тавараў у гандлі. «Гэта прадугледжвае і актывізацыю работы з айчыннымі вытворцамі, і іх падтрымку і кантрольныя мерапрыемствы для недапушчэння неабгрунтаванага ўвозу тавараў», — сказала **намеснік міністра антыманапольнага рэгулявання і гандлю Наталля ВАСІЛЕЎСКАЯ.**

Пастаўленая на 2024 год задача па ўдзельнай вазе айчынных тавараў у гандлі не выканана, акцэнтавала яна. «Таму ў пачатку года мы ўдзяляем пільную ўвагу таму, што трэба зрабіць, якія меры прыняць, каб выканаць дадзеныя паказчыкі», — адзначыла намеснік міністра. Паводле яе слоў, у 2024 годзе ўдзельная вага тавараў айчыннай вытворчасці склала 56,4 %. Пры гэтым харчовых — 76,3 %, нехарчовых — 37,3 %. Гэтыя паказчыкі неабходна павялічваць, падкрэсліла Наталля Васілеўская.

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2. УНП 191021390 |
| **Продавец** | ОАО «Белцветмет», Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, 42/2, район аг. Гатово. УНН 100088666 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1 (**www.ipmtorgi.by**) |

**Предмет электронных торгов: бывшее в употреблении имущество**

| № лота | Наименование | Начальная цена с НДС 20 %, бел. руб. |
|---|---|---|
| 1 | **Автомобиль MAZ 6501A8-325-000,** 2013 г. в. | **27 792,00** |
| 2 | **Прицеп MAZ 856103-(010), А 8286 В-5,** 2013 г. в. | **13 968,00** |
| 3 | **Прицеп MAZ 856103-(010), А 8287 В-5,** 2013 г. в. | **13 968,00** |
| 4 | **Бытовое помещение типа М-К2-2-15 В.1 (18 кв. м,** 2003 г. в.) | **1 800,00** |

Месторасположение лотов №№ 1–3: Минский р-н, Новодворский с/с, аг. Гатово, 42/2; лота № 4: Могилевский р-н, аг Полыковичи, ул. Подгорная, 1В

***Цена снижена по лотам №№ 1–3 на 40 %, по лоту № 4 на 50 %. Шаг аукциона: 5 % от текущей цены***

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191 021 390. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10 (десять)** рабочих дней со дня завершения электронных торгов |
| **Условия оплаты предмета электронных торгов** | **10 (десять)** рабочих дней с даты заключения договора купли-продажи |

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение по лотам №№ 1–3 – 5 %, по лоту № 4 – 10 % от цены продажи лотов в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов

Предыдущие извещения опубликованы в газете «Звязда»: по лотам №№ 1–3 – 08.02.2025, по лоту № 4 – 29.01.2025

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: с 11.00 до 12.00 13.03.2025.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

Заявки на участие в электронных торгах принимаются **по 12.03.2025 до 17.00** на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: **www.ipmtorgi.by**

**Контактные телефоны: +375 17-373-21-33, +375 29-317-95-42. E-mail: auction@cpo.by**

**ОАО «Светлогорский домостроительный комбинат» уведомляет о проведении электронных торгов по реализации следующего имущества**

**Извещение о проведении открытых электронных торгов по продаже имущества**

| № лота | Описание | Начальная цена, бел. руб. | Шаг аукциона, (5 %), руб. | Задаток, (10 %) руб. |
|---|---|---|---|---|
| 86903 | 2/5 доли (1593,5 кв. м) в имущественном праве на объект недвижимости – капитальное строение с инв. № 342/С-12380 общей площадью 3966,8 кв. м, назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – административное здание (инв. 0153дск), расположенное на земельном участке с кадастровым номером 325050100001004451 по адресу: Гомельская область, г. Светлогорск, ул. Свердлова, 9 | **507 360,00** | 25368,00 | 50736,00 |

**Аукцион № 21683 состоится 17 марта 2025 года с 09.00 до 16.00 на электронной торговой площадке** единой системы электронных торгов **по эл. адресу www.torgi.gov.by.**

Всю подробную информацию о лотах можно узнать на торговой площадке: **www.torgi.gov.by,** набрав в поиске интересующий лот.

Для участия в электронных торгах необходимо подать заявку на участие в электронных торгах и пройти регистрацию в качестве участника электронных торгов, а также перечислить задаток в срок до 09.00 17.03.2025. Заявитель вправе изменить или отозвать заявку не позднее дня окончания срока подачи заявок, направив организатору электронных торгов уведомление в виде электронного документа.

**Организатор аукциона:** ООО «Правовая Стратегия», антикризисный управляющий. **Продавец:** ОАО «Светлогорский домостроительный комбинат». Организатор торгов вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за пять дней до наступления даты его проведения.

Задаток перечисляется на р/с Республиканского унитарного предприятия «Информационный центр Министерства экономики Республики Беларусь»: BY88BELB30120027870020226000 ОАО «Банк БелВЭБ» БИК BELBBY2X ОКПО 37533622 УНП 190318109. Адрес: г. Минск, ул. Берсона, 1А, комн. 513. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе 21683 по лоту № 86903 (указывается № личного кабинета).

Победителем электронных торгов признается участник, предложивший максимальную цену за лот. Договор купли-продажи должен быть подписан не позднее 5 (пяти) дней со дня завершения электронных торгов. Срок оплаты 30 дней. Возмещение затрат на организацию и проведение электронных торгов осуществляется в соответствии с законодательством. Затраты на организацию и проведение электронных торгов утверждаются управляющим.

С правилами торгов можно ознакомиться по адресу: **www.torgi.gov.by**

Ознакомиться с объектом (лотом) аукциона можно в дни приема документов на участие в аукционе у продавца по адресу: Гомельская обл., г. Светлогорск, ул. Заводская, д. 10.

Контактное лицо для осмотра: +375 29 693 20 10 (Александр), по оформлению договора: 8 (02342) 5-85-23 (Марина)

ЭНЕРГАЭФЕКТЫЎНАСЦЬ

# ПАВЫШЭННЕ ЯКАСЦІ І КАНКУРЭНТАЗДОЛЬНАСЦІ

Апошнім часам павышэнне энергаэфектыўнасці эканомікі нашай краіны прыносіць добрыя вынікі. Гэта адзначыў намеснік старшыні Дзяржстандарту-дырэктар Дэпартамента па энергаэфектыўнасці Віталь Крэцкі. Асноўныя паказчыкі па энергазберажэнні за мінулы год выкананы. Галоўнае — гэта зніжэнне энергаёмістасці валавога ўнутранага прадукту на 2,6 % да 2020 года. Забяспечаны аб'ём эканоміі энергарэсурсаў на ўзроўні 606 тысяч тон умоўнага паліва. Акрамя таго, доля мясцовых паліўна-энергетычных рэсурсаў у валавым спажыванні энергарэсурсаў склала 17,1 %.



Віталь Крэцкі падкрэсліў, што летась, нягледзячы на тое, што валавое спажыванне энергарэсурсаў вырасла на 1,8 мільёна тон, наша краіна не толькі ўтрымала неабходную долю спажывання мясцовых паліўна энергарэсурсаў, але яшчэ яе і павялічыла. Гэта сведчыць аб тым, што сёння прырост спажывання энергарэсурсаў у асноўным ідзе за кошт уласных відаў паліва.

Кіраўніком дзяржавы і ўрадам пастаўлена задача па максімальна магчымым уцягванні ў энергабаланс краіны драўняных паліўных гранул. Прыняты шэраг нарматыўных дакументаў па зніжэнні кошту драўняных паліўных гранул для рэальнага сектара эканомікі. Асноўны ж інструмент — уцягванне дадзенага віду паліва ў энергабаланс нашай краіны. Гэта робіцца за кошт будаўніцтва і рэканструкцыі дзеючых энергакрыніц, перш за ўсё ў сістэме жыллёва-камунальнай гаспадаркі і энергетыкі, што прыводзіць не толькі да павышэння эфектыўнасці выкарыстання энергарэсурсаў, але і да зніжэння сабекошту цеплавой энергіі, што выпрацоўваецца.

Нягледзячы на тое, што сёння ў краіне дастаткова ўласных электрагенерацыйных магутнасцяў, працягваецца работа па развіцці аднаўляльных крыніц энергіі (АКЭ). Віталь Крэцкі адзначыў шэраг аб'ектаў, дзе ідзе іх актыўнае развіццё. Гэта перш за ўсё тэрыторыі, якія забруджаны ад аварыі на Чарнобыльскай атамнай электрастанцыі. Урадам пастаўлена задача па далейшым працягу работы ў гэтым кірунку.

«Фактычна ў нас ідзе барацьба за кожную кілават-гадзіну, за кожную гігакалорыю. Мы зніжаем не толькі спажыванне энергарэсурсаў, мы павялічым іх эфектыўнасць, і гэта вядзе да павышэння якасці прадукцыі, павышэння яе канкурэнтаздольнасці як на ўнутраным, так і на знешніх рынках», — адзначыў Віталь Крэцкі.

Дырэктар дэпартамента адзначыў, што БелАЭС — стварэнне абсалютна новага сектара ў эканоміцы. Сёння актыўна развіваецца электратранспарт, рэалізуюцца буйныя праекты, якія спрыяюць павелічэнню электраспажывання ў краіне.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# «ІДЗЕ ІНТЭНСІЎНАЯ ПАДРЫХТОЎКА»

## Эканамічны форум краін СНД адбудзецца ў сакавіку ў Маскве



Аб гэтым паведаміў журналістам генеральны сакратар СНД Сяргей ЛЕБЕДЗЕЎ, перадае карэспандэнт БелТА.

— У нас наперадзе некалькі важных сустрэч, форумаў. Эканамічны форум краін СНД пройдзе 28 сакавіка ў Маскве. Цяпер ідзе інтэнсіўная падрыхтоўка, ужо заяўлены вядомыя эканамісты, — адзначыў Сяргей Лебедзеў.

Далей у Ташкенце пройдзе шэраг буйных мерапрыемстваў эканамічнага плана.

— Эканамічны інавацыйны форум, пасяджэнне эканамічнага савета СНД. Падрыхтоўка да гэтых мерапрыемстваў актыўна вядзецца, — адзначыў генеральны сакратар.

Чарговае пасяджэнне Савета пастаянных паўнамоцных прадстаўнікоў дзяржаў — удзельніц Садружнасці пры статутных і іншых органах СНД праходзіць у Выканаўчым камітэце СНД у Мінску. На сустрэчы пастаянныя прадстаўнікі абмяркуюць вынікі дзейнасці Савета па супрацоўніцтве ў галіне фундаментальнай навукі ў 2020 — 2024 гадах, выкананне дарожнай карты па рэалізацыі ініцыятыў, выказаных кіраўнікамі дэлегацый падчас пасяджэнняў Савета кіраўнікоў дзяржаў, Савета кіраўнікоў урадаў, Савета міністраў замежных спраў і эканамічнага савета СНД, у частцы супрацоўніцтва ў сферы бяспекі.

Акрамя таго, удзельнікі пасяджэння плануюць разгледзець прапановы ў праект парадку дня чарговага пасяджэння Савета кіраўнікоў урадаў Садружнасці Незалежных Дзяржаў.



# «КВЕТКІ — НАЙЛЕПШЫ СПОСАБ ВЫКАЗАЦЬ СВАЕ ПАЧУЦЦІ!»

## Лясгасы рыхтуюцца да старту масавага гандлю цюльпанамі

Сёлета набыць свежыя кветкі можна будзе і на некаторых гандлёвых пляцоўках пад брэндам «Лясны домік», расказалі ў прэс-службе Мінлясгаса.

Напрыклад, Жлобінскі лясгас ужо паведаміў пра старт гандлю на фірменным гандлёвым аб'екце з 6 сакавіка.

— Кветкі — найлепшы спосаб выказаць свае пачуцці! — запэўнілі ў гаспадарцы, дадаўшы, што на пляцоўцы будуць прадстаўлены цюльпаны з гадавальнікаў лясгасаў Гомельскай вобласці.

# СХЕМЫ — СТАРЫЯ, НАГОДЫ — НОВЫЯ

## Што трэба ведаць, каб не стаць ахвярай злачынства

Тэлефонныя махляры і інтэрнэт-ашуканцы не спыняюць спроб залезці ў кашалькі нашых грамадзян. Калі адна схема не працуе, прыдумляюць іншую. Аднак, па сутнасці, спосабы падману застаюцца ўсё тымі ж. Мяняюцца толькі нагоды, з якімі да грамадзян звяртаюцца лжэміліцыянеры, псеўдаследчыя, выдуманыя работнікі банкаў, іншых дзяржаўных структур.

### ПАД ПРЫЦЭЛАМ — ПСІХАЛАГІЧНЫ СТАН

Калі ў 2021—2022 гадах сярод відаў махлярства пераважалі званкі пад так званай назвай «Алё, мама, я трапіў у бяду!», то цяпер, як правіла, на сувязь выходзяць псеўдаспецыялісты энергазбыту, мабільных аператараў. Спачатку яны выведваюць асабістыя даныя, затым паступае іншы званок — быццам бы ад праваахоўнікаў, якія прапаноўваюць паўдзельнічаць у спецаперацыі па вышуку махляроў. Апошнімі, па легендзе ашуканцаў, з'яўляюцца тыя ж супрацоўнікі энергазбыту або мабільных аператараў, з якімі грамадзяне падзяліліся сваёй персанальнай інфармацыяй.



«Прапаноўваючы аказаць дапамогу ў так званых спецаперацыях, махляры працуюць на свядомасць чалавека, які, па іх меркаванні, павінен адгукнуцца на просьбу прыцягнуць вінаватых да адказнасці, — звяртае ўвагу **намеснік начальніка ўпраўлення крымінальнага вышуку ГУУС Мінгарвыканкама падпалкоўнік міліцыі Андрэй АРЛОЎСКІ**. — У выніку дзеля «садзейнічання» праваахоўным органам грамадзяне бяруць крэдыты. Што датычыцца званкоў «Алё, мама!», якія хоць і радзей, але ўсё роўна працягваюць паступаць, — гэта таксама адзін са спосабаў вывесці чалавека з раўнавагі. Калі людзі чуюць, што іх блізкі трапіў у дарожна-транспартнае здарэнне, імкнуцца прыйсці на дапамогу. Натуральна, на эмоцыях нямногія ставяць усё гэта пад сумненне. Хоць у выніку, калі ўжо разумеюць, што трапілі на хітрасць махляроў, кажуць, што голас чалавека, які ім тэлефанаваў, не быў падобны на голас сваяка. Эмацыянальны фон у людзей настолькі парушаны, што яны вераць усяму, што ім кажуць, і не думаюць аб наступствах».

Гэтым і карыстаюцца ашуканцы. Выкарыстоўваючы псіхалагічныя прыёмы ўздзеяння, яны выводзяць чалавека на эмоцыі, каб ён не мог аб'ектыўна ацэньваць свае дзеянні, патэлефанаваць сваім родным і ўдакладніць, ці сапраўды яны трапілі ў бяду. Махляры, дарэчы, такой магчымасці не даюць: пастаянна трымаюць патэнцыяльных ахвяр на сувязі, запалохваюць. На жаль, у многіх выпадках людзі разумеюць, што іх падманулі, ужо пасля таго як аферысты завалодаюць зберажэннямі.

### ЗАНІЖАНЫ КОШТ... ЧАМУ Б НЕ ЗАДУМАЦЦА

Людзі настолькі прызвычаіліся да віртуальнага шопінгу, што часам нават лянуюцца выйсці ў краму па элементарны набор прадуктаў. Націснуў кнопачку — і табе не толькі прапануюць патрэбны тавар, а яшчэ даставяць яго па адрасе. Гэтым пачалі карыстацца і махляры, у якіх стала больш інструментаў для ажыццяўлення сваіх злачынных схем. Адна з найбольш папулярных — продаж тавараў, якія не існуюць, у інтэрнэце па заніжаных коштах. Зразумела, так закладзена прыродай, што чалавек імкнецца купіць нешта танней. Але трэба памятаць прымаўку пра бясплатны сыр і некалькі разоў пераправяраць інфармацыю. Асабліва павінна насцярожыць просьба аб перадаплаце, а тым больш — аб стопрацэнтнай.

«Адбываецца ўсё максімальна апатычна: чалавек павінен хутка выкачаць патрабаванні псеўдапраўдаўцоў, бо інакш застанецца без тавару, — заўважае намеснік начальніка ўпраўлення крымінальнага вышуку ГУУС Мінгарвыканкама. — Элемент паскорасці прысутнічае ва ўсіх злачынных схемах. Хутка перавесці грошы «арганізатарам спецаперацыі», інačай прыйдзе міліцыя з вобыскам. Хутка перадаць зберажэнні кур'еру, інакш непазбежна крымінальная справа ў адносінах да сваякоў, якія быццам бы трапілі ў ДТЗ. Структура — адна, нагоды для размовы — розныя. Вынік, якога дасягаюць злачынцы, — даведацца ўсю інфармацыю і на яе аснове атрымаць грашовыя сродкі».

Праваахоўнікі папярэджваюць: пры набыцці тавараў у інтэрнэце варта пераправяраць дамены, старонкі, адрасы. Ні ў якім разе не пераводзьце грашовыя сродкі на незнаёмы сайт у надзеі, што пранясе. Не ўпэўнены — пераправерце. Пачытайце, нарэшце, водгукі аб тым ці іншым маркетплэйсе.

### ПСЕЎДАБІРЖЫ І ІХ КЛІЕНТЫ

Адзін з апошніх трэндаў, які навязваецца аферыстамі, — хуткае ўзбагачэнне праз біржу. Прываблiваюць тым, што, уклаўшы пэўную колькасць фінансавых сродкаў, чалавек атрымае добры прыбытак. Першапачаткова размова ідзе аб невялікіх сумах: нават калі чалавек і сумняваецца ў сапраўднасці такога заробку, то рызыкаваць асабліва няма чым. У выніку грамадзяне пераводзяць грошы на падменны сайт — прыбытак расце. Так наўмысна робіцца для таго, каб паказаць, што такім чынам сапраўды можа зарабіць. Пры гэтым на пэўным этапе махляры дазваляюць вывесці пэўную суму. У выніку людзі з даверам ставяцца да такога спосабу заробку і павялічваюць сумы ўкладанняў. На пэўным этапе злачынцы блакіруюць сайт і ўсе грашовыя сродкі сыходзяць ім.

На такія хітрыкі ашуканцаў ужо двойчы трапіла пажылая жыхарка сталіцы. 80-гадовая пенсіянерка адгукнулася ў інтэрнэце на аб'яву аб «выплатах насельніцтву». З ёй неадкладна звязаўся «кансультант» і растлумачыў, што грошы можна атрымаць шляхам таргоў на біржы. Пацярпелая пераявіла для пачатку тры тысячы рублёў, пасля чаго ёй паведамілі, што сродкі нібыта заблакіраваныя, але хвалявацца не варта, неабходна крыху пачакаць. Не жадаючы губляць часу, мінчанка знайшла аб'яву аб інвесціраванні ў акцыі «Газпрама» і пры падтрымцы псеўдакансультанта пачала новыя таргі. З кожным наступным унёскам яе пераконвалі, што прыбытак павялічваецца і трэба працягваць укладаць.

У выніку за некалькі дзён пацярпелая адправіла зламыснікам амаль 50 тысяч рублёў. Пра тое, што яе падманулі, жанчына даведалася толькі тады, калі звярнулася да сваячкі з просьбай пазычыць грошай, каб вывесці заробленае з біржы. Следчымі ўзбуджана крымінальная справа за махлярства.

### ГРОШЫ МОЖНА ВЯРНУЦЬ

Улічваючы такія негатыўныя тэндэнцыі, калі грамадзяне пераводзяць грошы махлярам, канкрэтныя меры прынялі і банкаўскія ўстановы. Па-першае, цяпер заблакіравана магчымасць пераводу грашовых сродкаў за мяжу. Па-другое, папаўненне нават уласнага рахунку з нядаўняга часу ажыццяўляецца толькі па прад'яўленні пашпарта. Па-трэцяе, банкаўскі супрацоўнік некалькі разоў папярэджвае чалавека, які імкнецца аформіць крэдыт, што ён можа рабіць гэта пад уздзеяннем трэціх асоб. На жаль, не ўсе прыслухоўваюцца. І калі прыходзіць усведамленне аб здзейсненым, нярэдка бывае ўжо позна.

«Самая асноўная праблема — нашы грамадзяне чамусьці думаюць, што з іх ніколі не зракане, — звяртае ўвагу Андрэй Арлоўскі. — А другая — несвоечасова звяртаюцца ў органы ўнутраных спраў. Чым хутчэй пацярпелы звернецца ў міліцыю, тым большая верагоднасць таго, што злачынцы будуць затрыманы і грашовыя сродкі атрымаецца вярнуць. Усе інструменты для гэтага ў нас ёсць».

Важна, каб людзі сярэдняга ўзросту як мага часцей нагадвалі пажылым аб ашуканскіх схемах, падкрэсліваючы, што ніхто, акрамя махляроў, удакладняць пашпартныя даныя па тэлефоне не будзе, бо ў нас ёсць Закон «Аб абароне персанальных даных».

Навідавоку, што трансфармацыя схем злачынцаў — гэта ў тым ліку вынік эфектыўнай работы супрацоўнікаў органаў унутраных спраў. Аднак расслабляцца не варта. Трэба быць гатовымі да таго, што могуць з'явіцца новыя спосабы махлярства. Таму калі вы сутыкнуліся з нечым незнаёмым, то лепш пераправерыць, чым прадпрымаць канкрэтныя дзеянні, аб якіх потым будзеце шкадаваць.

**Вераніка КАНЮТА.**


ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации»** (Организатор аукциона) по поручению филиала **«Минский» открытого акционерного общества «Агрокомбинат «Дзержинский»** (Продавец) проводит открытый аукцион по продаже **одним лотом имущества в составе**:

- **капитальное строение с инв. № 600/С-176490 (сторожка с элементами благоустройства (забор железобетонный), общая площадь – 6,4 кв. м), адрес: Минская обл., Минский р-н, Горанский с/с, 62/6, район д. Звенячи;**
- **капитальное строение с инв. № 600/С-175581 (здание телятника, общая площадь – 889 кв. м), адрес: Минская обл., Минский р-н, Горанский с/с, 62А/4, район д. Аксаковщин;**
- **капитальное строение с инв. № 600/С-175568 (птичник № 1, общая площадь – 1549,2 кв. м), адрес: Минская обл., Минский р-н, Горанский с/с, 62, район д. Звенячи.**
- **капитальное строение с инв. № 600/С-175569 (птичник № 2, общая площадь – 1049,8 кв. м), адрес: Минская обл., Минский р-н, Горанский с/с, 62А/1, район д. Аксаковщина;**
- **капитальное строение с инв. № 600/С-175572 (птичник № 3, общая площадь – 1484,1 кв. м), адрес: Минская обл., Минский р-н, Горанский с/с, 62А/2, район д. Аксаковщина;**
- **капитальное строение с инв. №600/С-175574 (сарай для сена, общая площадь – 611,6 кв. м), адрес: Минская обл., Минский р-н, Горанский с/с, 62А/3, район д. Аксаковщина;**
- **капитальное строение с инв. №600/С-175587 (пометохранилище (инвентарный номер 7194-20, площадь – 3349 кв. м), адрес: Минская обл., Минский р-н, Горанский с/с, 62А, район д. Аксаковщина;**
- **капитальное строение с инв. № 600/С-175583 (Площадка для компостирования помета (инв. № 7194-1), площадь – 3068 кв. м), адрес: Минская обл., Минский р-н, Горанский с/с, 32,42 м севернее д. Звенячи;**
- **капитальное строение с инв. №600/С-175584 (скважина водоснабжения), адрес: Минская обл., Минский р-н, Горанский с/с, 32,42 м севернее д. Звенячи;**
- **капитальное строение с инв. № 600/С-175582 (башня водонапорная, общая площадь – 1,5 кв. м), адрес: Минская обл., Минский р-н, Горанский с/с, 62А/5, район д. Аксаковщина** ***(далее – объекты).***

**Объекты расположены на земельном участке с кадастровым номером 623681300001000829 площадью 4,0516 га, адрес земельного участка: Минская обл., Минский р-н, Горанский с/с, 62А, район д. Аксаковщина.**

Начальная цена с НДС (20 %) – **1 488 000,00** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – **148 800,00** бел. руб.

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации», код платежа – 40901,** код категории платежа OTHR.

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Победитель аукциона (единственный участник аукциона) возмещает Продавцу затраты на публикацию извещения о проведении торгов, а также оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 3 (трех) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Аукцион состоится **31.03.2025** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **27.03.2025** до **17.00** по указанному адресу в каб. 320.

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17.**
**Тел. для осмотра 8 (029) 116 45 00.**

УНП 601088545



Открытое акционерное общество

**«СТРОИТЕЛЬНЫЙ ТРЕСТ № 4»**

**сообщает, что 31 марта 2025 года в 11.00 состоится годовое общее собрание акционеров в актовом зале по адресу: г. Минск, ул. Коммунистическая, 17**

**Повестка дня:**

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2024 год и основных направлениях развития Общества на 2025 г.
2. О работе наблюдательного совета в 2024 г.
3. О результатах проверки ревизионной комиссией финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2024 г.
4. О результатах аудита финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2024 год. Утверждение годового отчета, годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности Общества за 2024 г.
5. Об утверждении порядка распределения прибыли, остающейся в распоряжении Общества за 2024 г. О выплате дивидендов за 2024 г.
6. Об утверждении порядка распределения прибыли, остающейся в распоряжении Общества, на 2025 г. и первый квартал 2026 г. Периодичность выплаты дивидендов за 2025 г.
7. О внесении изменений и дополнений в Устав ОАО «СТРОЙТРЕСТ № 4».
8. Об утверждении локальных правовых актов Общества (положение о ревизионной комиссии; положение о порядке учета аффилированных лиц).
9. Об избрании членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
10. О вознаграждении членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии

Реестр акционеров для участия в собрании акционеров будет сформирован по состоянию на 20 марта 2025 года.

С материалами к годовому общему собранию акционеров Общества можно будет ознакомиться по адресу: г. Минск, ул. Коммунистическая, 17, каб. 310:

- с 07.03.2025 по 31.03.2025 в рабочие дни с 09.00 до 17.00 с перерывом с 13.00 до 14.00, в день проведения собрания – с 09.00 до 10.00 – ознакомление с информацией о деятельности Общества за 2024 год;

- с 17.03.2025 г. по 31.03.2025 г. в рабочие дни с 09.00 до 17.00 с перерывом с 13.00 до 14.00, в день проведения собрания – с 09.00 до 10.00 – ознакомление с иными материалами по вопросам повестки дня годового общего собрания.

Время регистрации участников собрания: в день проведения собрания с 10.00 до 10.45 для акционеров Общества – по предоставлению паспорта, для представителя акционера – по предъявлении паспорта и доверенности.

Телефон для справок +375 17 311 20 33.

УНП 100055368

**Наблюдательный совет.**

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ
В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2. УНП 191021390 |
| **Продавец** | ОАО «Белцветмет», Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, 42/2, район аг. Гатово. УНН 100088666 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1 **(www.ipmtorgi.by)** |

**Предмет электронных торгов:**
бывшее в употреблении имущество.
Месторасположение:
Минский р-н, Новодворский с/с, аг. Гатово, 42/2

| № лота | Наименование | Начальная цена с НДС 20 %, бел. руб. |
|---|---|---|
| 1 | **Грузовой специальный автокран MAZ-631705 KS-55727-5**, 5HI T 0448 (АК 2052-5), 2010 г. в. | **95 160,00** |
| 2 | **Грузовой специальный самосвал MAZ 650118-8320-000**, АР 2447-5, 2015 г. в. | **100 920,00** |

***Шаг аукциона: 5 % от текущей цены***

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191 021 390. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10 (десять)** рабочих дней со дня завершения электронных торгов |
| **Условия оплаты предмета электронных торгов** | **10 (десять)** рабочих дней с даты заключения договора купли-продажи |

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение: по лоту № 1 – 5 %, по лоту № 2 – 3 % от цены продажи лотов в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

**Дата и время начала и окончания электронных торгов:**
**с 11.00 до 12.00 02.04.2025.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 01.04.2025 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by**

**Контактные телефоны: +375 17-373-21-33, +375 29-317-95-42.**
**E-mail: auction@cpo.by**

***Уважаемые акционеры***
***ОАО «МИНСКИЙ ДОМОСТРОИТЕЛЬНЫЙ КОМБИНАТ»!***

**31 марта 2025 года в 11.00**
**состоится годовое общее собрание акционеров**

**ОАО «МИНСКИЙ ДОМОСТРОИТЕЛЬНЫЙ КОМБИНАТ»**
**по адресу: г. Минск, ул. Пономаренко, 43 (актовый зал).**

**ПОВЕСТКА ДНЯ**
**годового общего собрания акционеров:**

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности ОАО «МИНСКИЙ ДОМОСТРОИТЕЛЬНЫЙ КОМБИНАТ» за 2024 год и основных направлениях развития Общества на 2025 год.
2. О работе наблюдательного совета в 2024 году.
3. О результатах проверки ревизионной комиссией финансово-хозяйственной деятельности ОАО «МИНСКИЙ ДОМОСТРОИТЕЛЬНЫЙ КОМБИНАТ» за 2024 год.
4. О результатах аудита финансово-хозяйственной деятельности ОАО «МИНСКИЙ ДОМОСТРОИТЕЛЬНЫЙ КОМБИНАТ» за 2024 год. Об утверждении годового отчета, годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности Общества за 2024 год.
5. Об утверждении порядка распределения прибыли, остающейся в распоряжении Общества, за 2024 год. О выплате дивидендов за 2024 год.
6. Об утверждении порядка использования и распределения прибыли на 2025 год и I квартал 2026 года. Периодичность выплаты дивидендов за 2025 год.
7. Об избрании членов наблюдательного совета.
8. Об избрании членов ревизионной комиссии.
9. О вознаграждении членам наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
10. О внесении изменений в Устав ОАО «МИНСКИЙ ДОМОСТРОИТЕЛЬНЫЙ КОМБИНАТ».
11. О внесении изменений в локальные правовые акты ОАО «МИНСКИЙ ДОМОСТРОИТЕЛЬНЫЙ КОМБИНАТ».

Реестр акционеров для участия в собрании акционеров будет сформирован по состоянию на 17 марта 2025 г.

С материалами по вопросам повестки для собрания, лица, имеющие право на участие в общем собрании акционеров, могут ознакомиться по адресу: г. Минск, ул. Пономаренко, 43 в следующем порядке:

- с 11.03.2025 по 30.03.2025 в рабочие дни с 09.00 до 16.30 по местонахождению Общества (каб. 304А), в день проведения собрания – с 09.00 до 10.30 по месту его проведения (актовый зал) – с информацией о деятельности Общества за 2024 год и основных направлениях деятельности на 2025 год;
- с 24.03.2025 по 30.03.2025 в рабочие дни с 09.00 до 16.30 по местонахождению Общества, в день проведения собрания – с 09.00 до 10.30 по месту его проведения – с иными материалами по вопросам повестки дня годового общего собрания акционеров.

Регистрация участников собрания будет осуществляться **31 марта 2025 г. с 10.00 до 10.45** по месту проведения собрания.

Для регистрации при себе иметь акционеру Общества – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.

*Наблюдательный совет*
*ОАО «МИНСКИЙ ДОМОСТРОИТЕЛЬНЫЙ КОМБИНАТ»*

УНП 100258980

# BELARUS — ГУЧЫЦЬ ГОДНА

## «БЕССІСТЭМНА ПРАЦАВАЦЬ НЕМАГЧЫМА»



Для таго каб зрабіць сапраўды якасную прадукцыю, патрэбна шматступенная сістэма кіравання якасцю, так званая сістэма менеджменту якасці, што ўкаранёна на прадпрыемстве. Пра гэта расказаў **намеснік генеральнага дырэктара ААТ «МТЗ» па якасці Ігар ЗЯМЦОЎ:** «Сістэма менеджменту якасці сертыфікавана, мы яе развіваем, бо толькі дзякуючы сістэмнаму падыходу можна дамагчыся добрага выніку. Бессістэмна працаваць немагчыма, асабліва ў якасці, тым больш у масавай вытворчасці, на канвееры. Шматступенная шматфункцыянальная сістэма дазваляе зняць выпуск неадпаведнай прадукцыі — калі не на першым этапе, дык на наступным».

Паводле слоў кіраўніка, на прадпрыемстве якасцю займаюцца ўсе, пачынаючы ад прыбіральшчыцы і заканчваючы генеральным дырэктарам: «Вядома, у маёй службе працуюць людзі, якія непасрэдна адказваюць за якасць, але той жа канструктар пры праектаванні вырабу павінен разумець, як ён будзе працаваць, як стане ўзаемадзейнічаць з іншымі вырабамі, ці будзе трактар прыдатны да рамонту і гэтак далей. На этапе стварэння новай мадэлі канструктар павінен закласці як мага менш памылак, бо калі чарцяжы, дакументацыя пайшлі ў вытворчасць, тут ужо кошт памылкі вырастае. Чым пазней мы яе выяўляем, тым даражэйшай яна становіцца».

На ААТ «МТЗ» функцыянуе служба якасці каля 700 чалавек, якая складаецца з упраўлення якасцю прадукцыі і ўпраўлення развіцця вытворчай сістэмы. Дарэчы, сюды ўваходзіць цэнтральная заводская лабараторыя. Паводле слоў Ігара Зямцова, гэта — сапраўдная «інтэлігенцыя флоту». У лабараторыі ўстаноўлены рэнтгенапараты, якія дазваляюць праверыць, напрыклад, ці ёсць расколіны на падшыпніках. Ёсць тут і электронныя мікраскопы, што дазваляюць высветліць наяўнасць розных адхіленняў, і іншае абсталяванне.

## ЯК ПРАЙСЦІ ПРАЗ «ВАРОТЫ ЯКАСЦІ»

Яшчэ адно падраздзяленне — аддзел кіравання якасцю. Гэта, па сутнасці, мазгавы цэнтр, у які сцякаецца ўся інфармацыя з усіх службаў. Аддзел аналізуе, што ў працэсе вытворчасці пайшло не так. Тут ёсць свая лабараторыя. Яе супрацоўнікі бяруць гатовы выраб і цалкам яго правяраюць.

«Мы прагналі 80 мадэляў трактара BELARUS 1222.3 праз лабараторыю, каб дабіцца стабільнай якасці. На наш канвеер можа паступаць адначасова 42 мадэлі тэхнікі. Гэта сапраўды вельмі складана, паколькі мы збіраем адзін трактар, адразу ж пераходзім да другога, трэцяга... З пункту гледжання машынабудавання гэта няправільна. На канвееры павінна знаходзіцца максімум дзве мадэлі адначасова. На жаль, у выніку пэўных абставін мы вымушаны выпускаць самую розную прадукцыю на адным канвееры. З пункту гледжання якасці гэта вельмі складана. Таму на канвееры ёсць кантралёры, так званыя вароты якасці прадпрыемства. У выпадку выяўлення няспраўнасці спыняецца канвеер, хутка пераправяраецца ўвесь зачын трактароў», — тлумачыць Ігар Зямцоў.

На МТЗ функцыянуе аддзел галоўнага метролага, які займаецца праверкай вымяральнага інструмента, што выкарыстоўваецца на заводзе. «Калі раптам супрацоўнікі аддзела няправільна праверацьпрыбор, які пацвярджае правільнасць вырабу дэталяў, нескладана здагадацца, да чаго гэта прывядзе», — расказвае намеснік гендырэктара.

Ігар Зямцоў адзначыў асаблівую ўвагу, якая надаецца зваротнай сувязі ад спажыўцоў праз службу сэрвісу: «Усе адмовы, што ўзнікаюць пры эксплуатацыі, паступаюць да нас. Мы іх аналізуем, сістэматызуем, глядзім, дзе і з якой прычыны нешта пайшло не так. Акрамя таго, мы арганізуем так званыя адзыўныя кампаніі».

У працэсе правядзення тэхнічнага абслугоўвання дэталь, якая выклікала сумненні, мяняецца. Паводле слоў намесніка гендырэктара па якасці, гэта робіцца для таго, каб апярэдзіць рэкламацыі: «Згодна з заканадаўствам, на працягу сутак мы павінны ліквідаваць любую няспраўнасць. У сельскай гаспадарцы самае галоўнае — тэрміны. Асабліва гэта важна пры правядзенні пасяўной і ўборачнай кампаній. «Кроў з носа», але трактар павінен працаваць днём і ноччу. На трактары магутнасцю менш за 250 конскіх сіл у нашай краіне гарантыя тры



гады. Калі магутнасць трактара звыш 250 конскіх сіл, гарантыя павялічваецца да пяці гадоў. Гэта сур'ёзны прамежак часу ў жыцці кожнага трактара. Пяць гадоў несці гарантыю складана. Тым не менш Мінскі трактарны завод ідзе на гэта, спадзеючыся на паразуменне з боку кліентаў. Такая адказнасць дапамагае павялічыць рэсурс, стварае стымул, каб змяніць канструкцыю, дапрацаваць матэрыялы і гэтак далей».

## НАДЗЕЙНЫ ТРАКТАР ПАТРЭБЕН УСІМ

МТЗ — уладальнік Дзяржаўнага знака якасці Рэспублікі Беларусь. Высокую ўзнагароду атрымаў трактар BELARUS 1222.3, які быў зроблены на базе папулярнай мадэлі BELARUS 1221. Гаворка ідзе пра глыбокую мадэрнізацыю трансмісіі, кабіны і ўсяго астатняга. Акцэнт зроблены на камфорце аператара з пункту гледжання абслугоўвання і работы.

«За кожнай узнагародай — вялікі калектыў спецыялістаў, прафесіяналаў, якія, не пакладаючы рук, працуюць на карысць роднага прадпрыемства і ўсёй краіны», — дадаў Ігар Зямцоў. Пры гэтым ён адзначыў, што трактар BELARUS 1222.3 і раней атрымліваў годныя ўзнагароды, а за сістэму менеджменту якасці МТЗ атрымаў прэмію ўрада.

Трактар BELARUS шырока вядомы як у нашай краіне, так і за яе межамі. Геаграфія паставак даволі шырокая, а многія замежныя рынкі добра вывучаныя. «Кліент чакае наш трактар, людзі прывыклі да яго. Палітыка — палітыкай, але простаму фермеру патрэбен надзейны агрэгат. Наш трактар — гэта шырока вядомы брэнд, таму марку трэба трымаць», — акцэнтаваў Ігар Зямцоў.

## АЙЧЫННЫЯ ДЭТАЛІ ПЛЮС КАМАНДА

Поспех вытворчасці якаснай прадукцыі напрамую залежыць ад работы кожнага супрацоўніка. Каб пераканацца ў гэтым, мы наведалі корпус зборкі трактароў. Сярод тых, хто адказвае за якасць пры вытворчасці, — **слесар механазборачных работ Ігар ДРАЧЭНІН.** Амаль чатыры гады



малады чалавек працуе на прадпрыемстве. «У асноўным я займаюся рухавікамі. Гэта іх праверка, устаноўка, мантаж, набіванне нумара і многае іншае».

У свой час Ігар Драчэнін скончыў Мінскі дзяржаўны машынабудаўнічы каледж. Пасля гэтага малады чалавек трапіў на МТЗ у якасці маладога спецыяліста. Пасля тэрміновай службы ў арміі і адпрацоўкі па размеркаванні ён вярнуўся на сваё першае працоўнае месца. «Для зборкі добрай тэхнікі вельмі важныя якасныя камплектавальныя, — падкрэслівае Ігар Драчэня. — Кожная мадэль індывідуальная, абсалютна ў кожную закладваецца розны камплект. Напрыклад, мадэль трактара BELARUS 1222.3 больш чым на 90 % складаецца з беларускіх камплектавальных. Яшчэ адна рэч, якая наўпрост уплывае на якасць, — згуртаваны калектыў. У нас працуюць людзі ўсіх узростаў. Старэйшае пакаленне на сваім прыкладзе дапамагае нам, маладым, абсалютна ва ўсіх пытаннях. Узаемападтрымка, узаемаразуменне, узаемадапамога — вось важныя аспекты работы нашага калектыву. Ад згуртаванасці залежыць якасць прадукцыі».

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД.**

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. )***




# КОМІНЫ МУЖНАСЦІ

## Сураж. Быль пра Бацьку Мінал

Пасёлак Сураж стаў другім пасля Лёзна раённым цэнтрам Віцебскай вобласці, вызваленым ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Гэта гістарычная падзея адбылася 28 кастрычніка 1943 года. Два гады і тры месяцы, з 10 ліпеня 1941 года, пасёлак знаходзіўся пад фашысцкай акупацыяй.



### ПАРТЫЗАНСКІ БАЦЬКА

Першыя партызанскія атрады на Віцебшчыне былі створаны ўжо ў ліпені 1941 года. Адзін з іх, які дзейнічаў на тэрыторыі Суражскага раёна, узначаліў дырэктар мясцовай кардоннай фабрыкі Мінай Шмыроў, імя якога ў будучым стане легендарным. У адзін з першых партызанскіх атрадаў на тэрыторыі БССР пад кіраўніцтвам Міная Піліпавіча ўвайшлі каля 20 рабочых фабрыкі. Ужо ў верасні 42-га, калі ў атрадзе налічвалася больш за сто чалавек, партызаны напалі на нямецкі гарнізон у Суражы, пасля чаго на пароме пераправіліся на правы бераг Заходняй Дзвіны і, знішчыўшы плаўсродак, схаваліся ў лясах.

У лістападзе 1941 года гітлераўцы праводзяць буйную аперацыю па ліквідацыі атрада Шмырова, падчас якой практычна ўсе партызаны гінуць. За галаву камандзіра немцы давалі 50 тысяч марак, дом, зямельны ўчастак і каня, аднак ніхто яго не выдаў. Самую найвышэйшую цану Бацька Мінай заплаціў сам: 14 лютага 1942 года яго чацвярых дзяцей расстралялі, малодшаму Мішу было ўсяго тры гады. Аркадзь Куляшоў напісаў аб гэтым адзін з самых кранальных сваіх твораў «Балада аб чатырох заложніках». Помнік дзецям Міная Шмырова размешчаны на тэрыторыі Суражскай сярэдняй школы Віцебскага раёна, якая носіць імя легендарнага камбрыга.

У красавіку 1942-га прайшоў сход партызанскіх камандзіраў, пасля якога была сфарміравана 1-я Беларуская партызанская брыгада. Камандзірам яе стаў Мінай Шмыроў, камісарам прызначылі Рычарда Шкрэда.

### «ДАРОГАЙ ЖЫЦЦЯ»

У лютым 1942 года на стыку флангаў нямецкіх груп армій «Цэнтр» і «Поўнач» у выніку ўдараў Чырвонай Арміі пры падтрымцы партызан, у тым ліку атрада Міная Шмырова, утварыўся 40-кіламетровы прарыў у лініі нямецкага фронту. У ваеннай гісторыі гэты феномен атрымаў назву Суражскія, або Віцебскія, вароты. 1-я Беларуская партызанская брыгада ўсімі сіламі павінна была ўтрымліваць гэты ўчастак, які служыў «дарогай жыцця» тысячам мірных жыхароў.

Феномен Суражскіх варот заключаўся ў тым, што яны дзейнічалі восем месяцаў — унікальны выпадак для ваеннага часу, бо падобныя разрывы ў лініі фронту з'яўляліся і ў іншых месцах, але ўтрымліваць іх так доўга не ўдавалася. З лютага да верасня 1942 года праз гэты калідор у тыл ворага сістэматычна накіроўваліся новыя партызанскія атрады, разведвальныя і дыверсійныя групы, зброя і боепрыпасы, медыкаменты, таксама ішла эвакуацыя ў тыл параненых партызан і мірнага насельніцтва Віцебшчыны. За гэты перыяд праз вароты эвакуіраваліся каля 200 тысяч чалавек, былі таксама вызвалены 15 сельсаветаў, яны цалкам знаходзіліся пад кантролем партызан.

У канцы верасня 1942 года «дарогу жыцця» ліквідавалі, але значнасць яе была настолькі вялікая, што камандаванне Чырвонай Арміі планавала правесці аперацыю па аднаўленні Суражскіх варот. На жаль, дабіцца гэтага не ўдалося: сувязь партызан з савецкім тылам падтрымлівалася толькі з дапамогай авіяцыі.

У 1977 годзе ў вёсцы Заполле Віцебскага раёна па праекце беларускага скульптара Віктара Ягадніцкага быў узведзены мемарыял «Віцебскія вароты», які з'яўляецца месцам памяці і смутку для жыхароў усяго паўночнага рэгіёна. Мемарыял даглядаюць педагогі і навучэнцы Запольскай базавай школы імя Р. У. Шкрэды, вароты з'яўляюцца цэнтральным месцам памятных мерапрыемстваў і патрыятычных аўтапрабегаў.

### ВЯРНУЛІСЯ НА ПАПЯЛІШЧА

Наступленне Чырвонай Арміі на Сураж пачалося 11 кастрычніка 1943 года з боку Веліжа, што на Смаленшчыне. У вызваленні пасёлка ўдзельнічаў 1189-ы стралковы полк пад кіраўніцтвам Пятра Курэні 358-й стралковай дывізіі. Узяць населены пункт адразу не ўдалося: вакол былі траншэі, кулямётныя гнёзды, драцяныя загароды, замініраваныя дарогі і палі. Высокія берагі Заходняй Дзвіны і Касплі таксама не спрыялі руху Чырвонай Арміі.

Больш за два тыдні за Сураж ішлі бai, толькі раніцай 28 кастрычніка ўдалося прарваць абарону праціўніка і выгнаць яго з пасёлка. Немцы адступілі і замацаваліся ў раёне вёсак Вымна—Котава. За вызваленне Суражскага раёна звання Героя Савецкага Саюза пасмяротна ўдастоены Анатоль Углоўскі, Аляксей Томскі, Генадзь Пацёмкін.

Пасля паведамленняў аб вызваленні Суража сюды сталі вяртацца жанчыны і дзеці. Карціна, якая адкрывалася месцічам, была страшнай: на месцах дамоў чарнелі абгарэлыя коміны, на ўвесь пасёлак засталося некалькі замініраваных будынкаў і зямлянкі. Аднак пачыналася новае жыццё на вызваленай зямлі, і гэта было галоўнае.

Указам Прэзідэнта Беларусі ад 19 красавіка 2010 года № 189 Сураж быў узнагароджаны вымпелам «За стойкасць і мужнасць у гады Вялікай Айчыннай вайны» і ганаровай граматай.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**
**Фота з адкрытых крыніц.**

### Дарэчы

На нядаўняй сесіі Мінскага гарсавета дэпутатаў было прынята рашэнне прысвоіць імя Бацькі Міная — у гонар Героя Савецкага Саюза Міная Піліпавіча Шмырова — новай вуліцы на скрыжаванні вуліц Рафіева і Ясеніна.

## ХРОНІКА Вялікай ПЕРАМОГІ

***«Звязда». № 40 — 28 лютага 1945 года***

**• На фронце**

«Чым бліжэй да лініі фронта, тым ясней сляды краху нямецкай ваеннай машыны. Амаль у кожным населеным пункце насустрач нашым байцам выбягаюць нашы браты і сёстры, былыя нявольнікі і нявольніцы прускіх памешчыкаў. Усюды можна назіраць радасныя і адначасова трагічныя сустрэчы».

Войскі 2-га Беларускага фронту зламалі супраціўленне праціўніка на захадзе ад горада Хойніц (Коніц) і за чатыры дні наступальных баёў прасунуліся ўперад да 70 кіламетраў. Немцы, пісала «Звязда», мелі тут выгадныя, загадзя падрыхтаваныя пазіцыі. Лясістая мясцовасць, багатая рэкамі і азёрамі, вельмі перашкаджала дзеянням нашых войскаў, што наступалі. Аднак савецкая пяхота, падтрыманая артылерыяй, змагла пераадолець абарончыя рубяжы праціўніка. «Жорсткія баі адбыліся за горад Шлохаў — моцны апорны пункт варожай абароны. З усхода горад прыкрываюць азёры. На паўночных і паўднёвых подступах да яго немцы пабудавалі доўгачасовыя абарончыя ўмацаванні. Зрабіўшы адыходны манеўр, нашы часці абышлі возера і ўварваліся на вуліцы Шлохау. Ва ўпорных баях варожы гарнізон быў разгромлен. Горад Шлохау — важны вузел чыгуначных і шасейных дарог — занят нашымі войскамі».

Паводле аператыўнай зводкі ад Савецкага інфармбюро, змешчанай у нумары газеты, у ходзе наступлення войскі фронту на тэрыторыі Памераніі авалодалі гарадамі Шлохау, Штэгерс, Хамерштайн, Бальдэнберг, Бубліц — важнымі вузламі камунікацый і моцнымі апорнымі пунктамі абароны немцаў, а таксама з баямі занялі больш чым 100 іншых населеных пунктаў, сярод якіх буйныя населеныя пункты Польнітц, Цэхлан, Ферстэнау, Дравен, Грос Клайн-Кіёдэ.

«У Брэслау нашы войскі, прадаўжаючы баі па знішчэнню акружанай у горадзе групіроўкі праціўніка, занялі 12 кварталаў.

На тэрыторыі Чэхаславакіі, на паўночным захадзе і захадзе ад горада Лучанец, яны, дзейнічаючы ў цяжкіх умовах горна-лясістай мясцовасці ў паласе Карпат, з баямі занялі населеныя пункты Вігляш, Звол Слатына, Баравіны, Грабаў Грунь, Орэмаў Лаз, Сенаград, Младоніцэ.

На другіх участках фронта — пошукі разведчыкаў і ў радзе пунктаў баі мясцовага значэння», — пісала «Звязда».

**• У тыле**

Весткі з розных куткоў Беларусі «Звяздзе» нярэдка дасылалі няштатныя карэспандэнты.

Паводле слоў майстара лесаўчастка Ухалода, што ў Глінінскім сельсавеце, Іларыёна Нельзікава, на лесаўчастку на той час працавала 11 дзяўчат. «3 першых дзён маёй работы на ўчастку я звярнуў увагу на разгортванне соцыялістычнага спаборніцтва, правільную расстаноўку рабочай сілы. Кожнаму звяну лесарубаў адведзен асобны ўчастак. Паміж звеннямі заключаны соцыялістычныя дагаворы на лепшае выкананне сваіх заданняў».

Дзяўчаты-падлеткі, напрыклад, спальвалі галлё. Стары Іван Круглік, пісала «Звязда», працаваў над завастрэннем піл.

«У часе абедзеннага перапынку я чытаю зводкі Совінформбюро, газеты. На гістарычныя перамогі Чырвонай Арміі на франтах Айчыннай вайны лесарубы і возчыкі адказваюць яшчэ большай прадукцыйнасцю працы. Так, звяно лесарубаў Андрэя Жылкі выконвае дзённую норму на 115 процэнтаў», — пісаў майстар.

**Вядучая рубрыкі Яна ВАЛАСАЧ.**


ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Государственное предприятие «МГЦН» **18 марта 2025 года** проводит **390-й открытый аукцион по продаже права заключения договоров аренды** капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности (далее – имущество)

| № предмета аукциона | Арендодатель имущества | Местонахождение имущества | Площадь (кв. м) | Размер коэффициента спроса к базовой ставке арендной платы (от 0,3 до 3) или размер арендной платы в БАВ | Начальная цена права заключения договора аренды имущества / сумма задатка (руб.) | Наименование и целевое использование имущества |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 48 | **Белорусский государственный университет, тел. +37517 209-55-22** | г. Минск, пр. Дзержинского, 87 | 24,0 | 3 | 127,87 | Часть холла под размещение центра по оказанию печатных услуг. **Срок аренды – 3 года** |
| 49 | **Государственное предприятие «Белгипродор», тел. +37529 713-05-42** | г. Минск, ул. Социалистическая, 26/18-1 | 1 491,5 | 2 | 1 986,68 | Помещение под станцию технического обслуживания, склад. **Срок аренды – 1 год** |
| 50 | | г. Минск, ул. Социалистическая, 26 | 990,0 | 2 800 руб. в мес. | 700,00 | Площадка под стоянку транспортных средств с ограждением. **Срок аренды – 1 год** |

Организатор аукциона – государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 10, тел. +375 (17) 360 42 22.
Аукцион состоится **18 марта 2025 г. в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 7 (зал аукционов).
Прием документов и консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 25 февраля 2025 г. по 12 марта 2025 г. включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.00) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6. Расчетный счет для перечисления задатка: BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583, кодификатор назначения платежа – 40901, назначение платежа – **задаток для участия в аукционе № 390 от 18.03.2025 по предмету аукциона № ___**

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах изложен в извещении о проведении аукциона, размещенном на интернет-сайтах: организатора аукциона – **www.mgcn.by** (раздел «Недвижимость в аренду»); Минского городского исполнительного комитета – **www.minsk.gov.by** (раздел «ПРОДАЖА/АРЕНДА»); Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь – **www.gki.gov.by** (раздел «ПРОДАЖА/АРЕНДА ИМУЩЕСТВА»).
Телефон для справок **+375 (17) 360 42 22**

# КАЛІ САСУД ВЫНОСІЦЬ ПРЫСУД

## МНПЦ хірургіі, трансплантalогіі і гематалогіі рэалізуе пілотны праект па лячэнні інсультаў

Дзякуючы распрацоўкам медыкаў і ўкараненню некаторых навацый смяротнасць ад гэтай сасудзістай катастрофы ўдалося знізіць удвая — з 20 да 10 %.
У прыватнасці, тут было адкрыта адзінае ў краіне аддзяленне кароткатэрміновага знаходжання, куды хворыя з інсультам трапляюць адразу з прыёмнага пакоя. Такая рэарганізацыя дазволіла не толькі дасягнуць зніжэння паказчыка лятальнасці, але і дапамагла сэканоміць каля 300 тысяч рублёў у год.

### ТРАПІЦЬ У «ТЭРАПЕЎТЫЧНАЕ АКНО»

Штогод у стацыянары з вострым інсультам пастyпае звыш 40 тысяч чалавек. У краіне гэта адна з трох асноўных прычын смяротнасці. Акрамя таго, захворванне часта становіцца прычынай інваліднасці. У сталіцы штогод каля 7,5-8 тысяч пацыентаў з інсультамі. У асноўным пераважаюць ішэмічныя — іх пераносяць каля 35 тысяч чалавек, каля пяці тысяч штогод атрымліваюць гемарагічныя інсульты, каля тысячы — разрыў анеўрызмы. Распрацоўкі беларускіх медыкаў дазваляюць дапамагаць большасці з іх, пастаянна зніжаючы смяротнасць.

Каля дзвюх тысяч пацыентаў з інсультам штогод паступаюць у Мінскі навукова-практычны цэнтр хірургіі, трансплантaлогіі і гематалогіі, акрамя таго, мінчан лечаць яшчэ ў дзвюх сталічных клініках. Усе ўстановы — экспертнага ўзроўню, а значыць, прымяняюць усе магчымыя спосабы лячэння вострага інсульту.

— За апошнія гады мы зрабілі вырашальны крок наперад і з'яўляемся драйверам росту для ўсёй краіны, — адзначае **загадчык аддзела неўралогіі і нейрахірургіі МНПЦ хірургіі, трансплантaлогіі і гематалогіі, галоўны пазаштатны спецыяліст па ангіянеўралогіі Міністэрства аховы здароўя Сяргей МАРЧАНКА**. — Толькі 30 % пацыентаў звяртаюцца па медыцынскую дапамогу своечасова, хацелася б, каб іх было больш. На жаль, людзі дрэнна ведаюць сімптомы гэтага захворвання.

Калі брыгада хуткай дапамогі падазрае інсульт, і пацыент знаходзіцца ў так званым тэрапеўтычным акне — ад пачатку захворвання прайшло не больш за 4,5 гадзіны — адпаведнае паведамленне паступае на службовы тэлефон дзяжурнаму ўрачу-неўролагу, які сустракае пацыента ў прыёмным аддзяленні. Там яго абследуюць, у тым ліку праводзяць КТ, лабараторныя аналізы і максімальна хутка пачынаюць лячэнне.

Далей пацыента пераводзяць у аддзяленне кароткатэрміновага знаходжання. Па колькасці і якасці абсталявання яно, дарэчы, падобнае на аддзяленне рэанімацыі. Тут пацыент знаходзіцца ад 24 да 72 гадзін, кваліфікаваны персанал сочыць за яго станам і аказвае дапамогу. Гэта аддзяленне на базе МНПЦ хірургіі, трансплантaлогіі і гематалогіі пакуль адзінае ў краіне. Пілотны праект быў рэалізаваны Камітэтам па ахове здароўя Мінгарвыканкама.

— Усе пацыенты, нават тыя, у каго неўралагічныя сімптомы ўжо зніклі, шпіталізуюцца ў гэта аддзяленне. Яны ўсё роўна маюць патрэбу ў медыцынскім назіранні, бо рызыка, што сімптаматыка на працягу найбліжэйшых дзён вернецца, на жаль, велізарная. Хворыя пры неабходнасці адразу атрымліваюць трамбалітычную тэрапію і застаюцца жывымі. За два гады існавання аддзялення смяротнасць удалося знізіць удвая. У 2021 годзе колькасць тромбаэкстракцый і трамбалізісаў пры інсультах складала 3,3 %, летась ужо — 26,5 %. Наш праект літаральна на мінулым тыдні прызнаны паспяховым, і хочацца спадзявацца, што такія аддзяленні з'явяцца па ўсёй краіне, — адзначае Сяргей Марчанка.



Летась у краіне тромбаэкстракцыі атрымалі 653 пацыенты, у тым ліку 330 — у бальніцах Мінска, 130 — у МНПЦ хірургіі, трансплантaлогіі і гематалогіі. Яшчэ некалькі гадоў таму іх было ўсяго некалькі дзясяткаў на ўсю краіну.

— Гэта сур'ёзная дынаміка, менавіта таму мы лічым сябе драйверамі росту і запрашаем да сябе на павышэнне кваліфікацыі калег з іншых клінік, — адзначае Сяргей Марчанка.

Адны суткі знаходжання ў рэанімацыі МНПЦ хірургіі, трансплантaлогіі і гематалогіі каштуюць ад 950 да 2500 рублёў. Дзякуючы функцыянаванню аддзялення кароткатэрміновага знаходжання, удаецца сэканоміць каля 300 тысяч рублёў у год.

### ЧАМУ ЎЗНІКАЕ ПАРУШЭННЕ КРОВАЗВАРОТУ?

Інсульт не здараецца ў здаровых людзей. Да вострага парушэння кровазвароту ў галаўным мозгу пацыент ідзе ўсё сваё жыццё, нездаровае харчаванне — у ліку тых фактараў, якія прыводзяць да негатыўных вынікаў.

Як адзначыў **намеснік дырэктара па медыцынскай частцы Мінскага навукова-практычнага цэнтра хірургіі, трансплантaлогіі і гематалогіі Алег КАЛАЧЫК**, фарміраванне паталогій сасудаў галаўнога мозгу адбываецца кожны дзень пры невыкананні пэўных правіл, патрабаванняў нармальнай жыццядзейнасці.

— Паверце мне, ні ў адной краме, ні ў адным супермаркеце маркетолагі, расстаўляючы тавары на паліцах, не думаюць аб прафілактыцы паражэння сасудаў галаўнога мозгу і недапушчэнні інфаркту галаўнога мозгу. На бачных месцах на паліцах супермаркета стаяць не самыя карысныя прадукты, ежа з высокім утрыманнем солі і тлушчаў, — адзначыў Алег Калачык

Ён звярнуў увагу, што ў адрозненне ад інфаркту міякарда, інсульт часта не баліць. Пацыент можа нейкі час не звяртаць увагу, што аслабла канечнасць, з'явіліся праблемы з маўленнем, «мушкі» перад вачыма. А пасля нярэдка наступае такі стан, калі хворы ўжо не можа самастойна выклікаць хуткую дапамогу.

### МОЖА ЗДАРЫЦЦА І Ў МАЛАДЫХ

Сярод асноўных сімптомаў інсульту — перакошанасць твару, парушэнне маўлення, якія ўзнікаюць раптоўна, слабасць у руцэ ці назе. Аднаго з гэтых сімптомаў дастаткова, каб забіць трывогу і звярнуцца па дапамогу, ну а ўсе адразу амаль стапрацэнтна сведчаць пра сасудзістую катастрофу.

Каля 95 % пацыентаў з інсультам — гіпертонікі, кожны другі мае цукровы дыябет, парушэнні рытму сэрца ці парушэнні ліпіднага абмену (высокі халестэрын). Каб засцерагчыся ад інсульту, такія хворыя павінны сачыць за ўзроўнем ціску, цукру, халестэрыну.

Пераважная большасць пацыентаў з інсультамі — людзі непрацаздольнага ўзросту, каля 5 % — да 45 гадоў. Самай юнай пацыенткай МНПЦ хірургіі, трансплантaлогіі і гематалогіі была 15-гадовая дзяўчынка.

— Гэта цяжкая гісторыя для ўрачоў. Пацыентка паступіла з парушэннямі маўлення, слабасцю ў канечнасцях, і на вачах урачоў гэта сімптаматыка нарастала. Ні ў адным пратаколе не прапісана прымяненне рэперфузійнай тэрапіі ў непаўналетніх. Выхадны дзень — параіцца няма з кім. Аднак нашы ўрачы зрабілі ўсё як і належыць, у выніку дзяўчынка выжыла і выпісалася ад нас здаровай, — расказаў Сяргей Марчанка.

**Алена КРАВЕЦ.**


## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНОВ

### по продаже не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов и земельных участков, на которых они расположены, в частную собственность граждан Республики Беларусь

**Аукционы состоятся 31 марта 2025 года в 14.00 по адресу: 225510, Брестская область, г. Столин, ул. Советская, 69**

Аукционы проводятся в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23 марта 2018 г. № 220 «О некоторых мерах по реализации Указа Президента Республики Беларусь от 26 декабря 2017 г. № 463».

Прием заявлений об участии в аукционе осуществляется по адресу: **г. Столин, ул. Советская, 69, каб. 20 с 08.00 до 17.00 (обеденный перерыв с 13.00 до 14.00) начиная с 28 февраля 2025 г. по 25 марта 2025 г. до 17.00.**
Организатор и продавец – Столинский районный исполнительный комитет.

**Лот № 1:**

Незавершенный строительством незаконсервированный жилой дом (наружная площадь застройки – 101 кв. м, степень готовности – 7 %, составные части и принадлежности: хозблок, погреб под строением, уборная, навес, навес, забор) и право собственности на земельный участок с кадастровым номером 125850100001000131 площадью 0,1406 га (земли под застройкой), целевое назначение – для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания одноквартирного (блокированного) жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме) код 1 09 02), расположены по адресу: г. Столин, ул. Ленина, 49.

Инженерная и транспортная инфраструктура: электроснабжения, газоснабжения, водоснабжения. Наличие асфальтированного подъезда.

Условия развития инфраструктуры: за счет застройщиков.

Начальная цена предмета аукциона, цена лота (начальная цена не завершенного строительством жилого дома / начальная цена земельного участка): 45 721,91 рублей (31 240,11 рублей / 14 481,80 рублей).

Затраты на организацию и проведение аукциона: 384,04 руб., плюс затраты на объявления в СМИ о проведении аукциона, согласно актам выполненных работ.

